Бальшавіцкае прывітаньне III сэсіі ЦВК БССР X скліканьня

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь
ראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

АЎТОРАК 5 ЛІПЕНЯ 1932 г.
№ 148 (3527)

Першае паседжаньне 3-й сэсіі ЦВК БССР 10-га СКЛІКАНЬНЯ АДКРЫЕЦЦА

6-га ліпеня а 5-й гадзіне ў залі до у Камасьветы (б. клюб К. Маркса)

Сакратар ЦВК БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ

ПАСЕДЖАНЬНЕ КАМУНІСТЫЧНАЙ ФРАКЦЫІ ЦВК АДБУДЗЕЦЦА

6 ліпеня а 4 з палов. гадзіне ў залі дому Камасьветы (б. клуб К. Маркса)

Бюро фракцыі прэзыдыуму

Да III сэсіі ЦВК

Рапартаваць аб перамогах, мабілізавацца да новых баёў

Мы робім нячуваную ў гісторыі справу—мы будуем сацыялізм, будуем яго рукамі мільённых мас рабочае клясы і сялянства.

Лічбы разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці БССР і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, рост калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, нясупынны рост культурнага будаўніцтва і паляпшаньня дабрабыту працоўных, ператварэньне БССР з краіны аграрнай у краіну індустрыяльна-аграрную—у краіну буйных сацыялістычных фабрык жывёлагадоўлі і тэхнічных культур,—вось факты, якія красамоўна сьведчаць аб тых вялізарнейшых дасягненьнях, якіх Савецкая Беларусь дабілася, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК. Пры непасрэднай дапамозе брацкіх рэспублік Савецкая Беларусь пасьпяхова завяршае пяцігодку ў чатыры гады.

Трэцяя сэсія ЦВК БССР дзесятага скліканьня, якая заўтра пачынае сваю работу, разгледзіць тры пытаньні: 1) вынікі вясенняй сяўбы і задачы ўборачнай кампаніі, 2) гарадзкое будаўніцтва і 3) задачы саветаў у выкананьні пастаноў партыі і ўраду аб калгасным гандлі—гандлі калгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў—сялян сельскагаспадарчымі прадуктамі і прасоўваньні да іх тавараў шырокага спажываньня. Вырашэньне гэтых трох пытаньняў зьяўляецца на даным адрэзку часу важнейшаю задачаю ў агульным ланцугу разьвіцьця сельскай гаспадаркі і паляпшаньня дабрабыту працоўных гораду і вёскі.

Аналізуючы становішча правядзеньня кампаніі трэцяй бальшавіцкай, патрэбна сказаць, што ў гэтым напрамку мы дабіліся значных посьпехаў.

Мы дабіліся росту агульнай плошчы пасеву ў параўнаньні з 1931 годам на 216717 га, або на 9,9 проц. У тым ліку мы маем павялічэньне пасеваў па саўгасах на 63,7 проц. супроц. 1931 году, па калгасах—на 28,3 проц. і па МТС—на 128,1 проц. пры павялічэньні яравога кліну калектыўных гаспадарак на 33 проц. супроць мінулага году.

Калі ўдзельная вага вядучых культур калгасаў у мінулым годзе складала 48,4 проц., дык у гэтым годзе мы ўжо маем 59,1 проц. Калі ўзяць лічбы пасеву па сацэктару па паасобных культурах ў параўнаньне з мінулым годам, дык мы атрымаем, што па сеў яравога кліну павялічыўся з 49 проц. у мінулым годзе да 59,8 проц. у гэтым годзе, па ільну з 52 проц. да 63 проц. і па бульбе з 47,9 проц. да 55,4 проц..

Мы таксама маем павялічэньне агульнага проценту пасеву і па адна асобным сэктары. Калі ў 1931 годзе процант выкананьня пляну пасеву дасягаў 75,1 проц., дык у гэтым годзе мы маем 89,4 проц. Наогул плян пасеву па БССР на 25 чэрвеня выканаў на 90 проц., а калі ня лічыць сустрэчную лічбу Наркамзему БССР у 220 тыс. га, дык процант пасеву дасягае 96, супроц. 87 проц. мінулага году.

Побач з гэтым мы маем значныя павялічэньні капіталаўкладаньняў у сельскую гаспадарку. Так, калі ў 1931 годзе на адну калгасную гаспадарку капіталаўкладаньні складалі 116 рублёў, дык у гэтым годзе яны дасягнулі 163 руб.

Характэрныя лічбы росту мы маем па МТС. Так, калі ў 1931 годзе па БССР налічвалася 27 МТС з агульнай магутнасьцю трактарнага парку ў 878 конскіх сіл, дык ў 1932 годзе мы ўжо налічваем 57 МТС з трактарным паркам у 16.850 конскіх сіл. Гэтыя лічбы росту красамоўна гавораць самі за сябе.

Выключнае гаспадарча-палітычнае значэньне адыграла рашэньне ЦК УсеКП(б) і Саюзнага ўраду аб сельска-гаспадарчым падатку, збожжа- і мясазагатоўках і калгасным гандлі, якія стварылі спрыяючыя ўмовы для пасьпяховага выкананьня пляну трэцяй бальшавіцкай сяўбы, стварыўшы дадатковыя ўмовы росту вытворчых сіл краіны.

Аднак, дасягнутыя посьпехі нельга лічыць здавальняючымі, бо ў гэтую пасеўную кампанію мы мелі ўсе ўмовы для 100 процантнага выкананьня пасеўных плянаў. У выніку зусім недастатковага ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў тав. Сталіна, недастаткова правядзеньня арганізацыйнай гаспадарчай падрыхтоўкі з боку зямельных і савецкіх арганізацый да вясенняй сяўбы, слабасьці апэрацыйнага кіраўніцтва сяўбой, на некаторых раёнах, калгасах пляны значна недавыкананы.

Вясеньняя пасеўная кампанія паказала, што асноўныя элементы арганізацыі гаспадарчага ўмацаваньня калгасу: увядзеньне зьдзельшчыны, арганізацыя брыгад па вытворчым прынцыпу са сталым складам калгасьнікаў, правільнай расстаноўкі і скарыстаньнем людзкой, мэханічнай і конскай сілы, аўладаньне апаратэхнікай, яшчэ далёка ня ўсюды сталі ў цэнтры ўвагі калгасаў, саўгасаў і МТС, у выніку чаго мы маем недавыкананьне пляну сяўбы.

Выключнае значэньне зараз набываюць праполачная, уборачная і сенаўборачная кампаніі. Арганізаваць праполку і ўборку ў найкарацейшы тэрмін з найменшымі тратамі—адказьнейшая задача, якая паўстае перад калгасамі, саўгасамі і МТС.

Мабілізацыя шырокіх мас калгасьнікаў, правядзеньне шырокай растлумачальнай работы вакол гэтых важнейшых цытаньняў—баявая і адказная задача для саветаў.

Пастанова партыі і ўраду аб збожжазагатоўках і мясазагатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю, зараз набываюць, як ніколі, выключнае значэньне. Ад таго, наколькі шпарка мы сумеем разгарнуць тавараззарот паміж горадам і вёскай, ад таго наколькі мы зможам арганізаваць выпуск тавараў шырокага спажываньня залежыць далейшае зьніжэньне рынкавых цэн, залежыць далейшае паляпшаньне матар'яльнага дабрабыту працоўных.

Аднак, патрэбна канстатаваць, што з боку аб'яднаньняў і асобных прадпрыемстваў да апошняга часу мела месца яўная недаацэнка важнасьці выробу тавараў шырокага спажываньня, за лік мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і стварэньня асобных утыльцэхаў. У сувязі з гэтым мы толькі ў ліпені месяцы наглядаем некаторы паварот у бок разгортваньня выробу тавараў шырокага спажываньня.

Наркамлёгпрам зрабіў рад практычных захадаў, якія павінны ўзбясьпечыць павялічэньне выробу і завозу на калгасны рынак тавараў шырокага спажываньня.

Па пляну Наркамлёгпраму ў 1932 г. павінна быць выпушчана тавараў шырокага спажываньня бяз зьмен асортыменту на 5793 тыс. рублёў, якія разгаліньваюцца так: па тэкстыльаб'яднаньні—1950 тыс. руб., па швэйаб'яднаньні—на 2176 тыс. руб., па скурааб'яднаньні—на 468 тыс. руб., па запалкааб'яднаньні—на 286 тыс. руб., па паліграфаб'яднаньні—на 198 тыс. руб., галантарэі—688 тыс. рубл., і па шклоаб'яднаньні—на 170 тыс. руб. Выраб гэтай прадукцыі ў значнай ступені зьявіцца стымулам да пасьпяховага разгортваньня калгаснага гандлю і паляпшаньня дабрабыту працоўных.

Разгортваньне будаўніцтва сацыялізму паставіла перад партыяй і савецкай уладай вялізарную задачу—стварэньня новых сацыялістычных гарадоў і рэканструкцыю старых, забясьпечыўшы ўздым і ахову здароўя мас, падвышэньне вытворчасьці працы і перабудову рабочага быту на сацыялістычны лад.

Мы маем значныя дасягненьні ў камунальным будаўніцтве. Так, за апошнія часы пабудавана і адноўлена 752,3 тыс. кв. мтр. жылой плошчы, пабудаваны новы трамвай у Менску, магутнасьць Менскага водаправоду павялічана з 1728 куб. мэтраў да 7000 куб. мтр., Мазырскага водаправоду з 600 кб. мтр. да 2000 кб мтр., пабудаваны зусім новыя тры водаправоды, пабудавана таксама каналізацыя ў Менску, даўжынёю ў 25 кілёмэтраў, 19 лазьняў, 20 электрастанцый, магутнасьцю 14943 кіловат-гадзін.

Расьце культурны ўзровень працоўных мас. Пабудаваны дзяржаўны ўніверсытэт, будуецца дом ураду і рад іншых культурных пабудоў—клюбы, тэатры. З году ў год значна ўзрастаюць капіталаўкладаньні на жыльлёвае і камунальнае будаўніцтва.

Аднак, сучаснае становішча гарадзкой гаспадаркі, ня гледзячы на значныя дасягненьні, яўна адстае ад узрастаючых патрэб рабочых мас, адстае ад агульнага разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва. Чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б), які адбыўся ў 1931 г., паставіў перад партыйнымі, савецкімі, прафсаюзнымі і гаспадарчымі органамі баявую задачу—ліквідаваць адставаньне гарадзкой гаспадаркі ад агульнага разьвіцьця прамысловасьці, падняўшы яе на вышыню, адпавядаючую гіганцкаму росту сацыялістычнай прамысловасьці і ўзрастаючым культурным запатрабаваньням рабочае клясы.

Мы маем вялізарныя магчымасьці для пасьпяховага вырашэньня гэтых задач, але за рэалізацыю гэтых магчымасьцяй трэба па-бальшавіцку змагацца на ўсіх вучастках жыльлёвага і камунальнага будаўніцтва. Больш жывасьці і энэргіі, больш актыўнасьці і грамадзкасьці, больш цьвёрдасьці і энцыятывы ў рабоце камунальных органаў.

Пытаньні жыльлёвага і гарадзкога будаўніцтва непасрэдна закранаюць самыя шырокія масы працоўных. Мабілізацыя гэтых мас, рашучая барацьба з усімі праявамі ў органах камунальнай гаспадаркі бяздушнага бюракратызму, непаваротлівасьці—важнейшая ўмова посьпеху. Нельга ні на мінуту забываць, што барацьба за разгортваньне гарадзкога будаўніцтва, за культурнае жыльлё, за чыстату ў гарадох, за тое, каб у іх было больш зелёных насаджэньняў, за выбрукаваную вулёцу, за трамвай, за водаправод, за каналізацыю, за чыстую лазьню і пральню—зьяўляецца важнейшай сустаўной часткай барацьбы за паляпшаньне матар'яльнага і бытавога становішча працоўных.

6-е ліпеня— дзевятую гадавіну канстытуцыі СССР—працоўныя БССР адзначаць вялізарнымі дасягненьнямі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Гэты адрэзак часу зьяўляецца перыядам гіганцкай барацьбы за генэральную лінію ленінскай партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку, за ўмацаваньне органаў савецкай улады, за савецкую канстытуцыю.

ДЭПУТАЦКІЯ ГРУПЫ „БАЛЬШАВІК" І „КАМУНАР" У гонар трэцяй сэсіі ЦВК

Мабілізаваць кожную дэпутацкую групу на сваячасовую і добраякасную ўборку ўраджаю

У гонар 3-й сэсіі ЦВК арганізуем спаборніцтва груп на лепшы ўдзел у праполачнай і ўборачнай кампаніях

Мы зусім блізка падыйшлі да аднае самае галоўнае і самае важнае работы—да правядзеньня ўборачнай кампаніі. Уборачная кампанія г. г. зьяўляецца для нас вялізным гаспадарча палітычным экзаменам. Ад посьпеху яе залежыць посьпех работы на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва і асабліва посьпех правядзеньня асеннняй сяўбовай кампаніі 1932 году.

У правядзеньні ўборачнай кампаніі асабліва вялікае значэньне адыгрывае арганізатарская роля саветаў, актыўны ўдзел дэпутацкіх груп, актыўны ўдзел кожнага дэпутата ў паасобку.

Правільнае разуменьне задач, пастаўленых перад дэпутацкімі групамі на час веснавой сяўбы, наша дэпутацкая група заводу «Камунар» ужо давала. Гэта разуменьне яна давяла на прыкладзе работы, праведзенай ёю ў прыгараднай гаспадарцы, якой намі была аказана практычная, канкрэтная дапамога ў правядзеньні сяўбы.

Работай прыгараднай гаспадаркі дэпутацкая група зацікавілася яшчэ ў мінулым годзе. Тады яна наткнулася ў саўгасе на недахват кармоў, на недыс цыплінаванасьць некаторых рабочых, якія дэзарганізоўвалі вытворчасьць. Група выявіла таксама і тое, што такое становішча тлумачылася нераспаўраджальнасьцю і безгаспадарчасьцю кіраўнікоў.

Наладзіць работу ў саўгасе—справа была нялёгкая. Але, пад кіраўніцтвам партыйнага калектыву і прафсыяльных арганізацый заводу, дэпутацкая група дамаглася таго, што прыгарадная гаспадарка з самых адстаючых выйшла ў рады перадавых.

Група дамаглася гэтага шляхам прымацаваньня сталай брыгады да гаспадаркі і станаўленьня грамадзкага кантролю над усёй работай яе. Група дапамагла арганізацыі працы, дамаглася павышэньня прадукцыйнасьці працы. Быў арганізаваны дэпутацкі пост у самым саўгасе. Адрамантавалі інвэнтар, набылі для гэтага адпаведныя матар'ялы. Група першай узьняла пытаньне перад партыйнай арганізацыяй і заводаўраўніцтвам аб пераключэньні заводскага транспарту на вывазку гною з саўгасе.

Дэпутацкая група ўмешвалася ў кожную «дробязь» работы гаспадаркі.

Аднак, мы зрабілі ня ўсё для таго, каб забясьпечыць посьпех работы на кожным вучастку прыгараднай гаспадаркі. Мы дабіліся яшчэ больш вынікаў па дапамозе гаспадарцы пры тэй умове, калі яшчэ больш мабілізуем усе сілы свае дэпутацкае групы на правядзеньне праполачнай і ўборачнай кампаніі.

На час праполачнай і ўборачнай кампаніі ў гонар 3-й сэсіі ЦВК мы бярэм на сябе наступныя абавязкі:

Прыняць непасрэдны ўдзел у праполцы засеваў у гаспадарцы і мабілізаваць на гэту справу усіх рабочых заводу.

Дамагчыся неадкладнага і поўнага выдзяленьня для прыгараднай гаспадаркі сенажацяй.

На сенажаці арганізаваць дэпутацкі пост па нагляду за сваячасовым і добраякасным сенакашэньнем.

Хадайнічаць перад адпаведнымі арганізацыямі аб вызначэньні фондаў на капітальнае будаўніцтва ў нашым прыгарадным саўгасе ЗРК.

Узяць пад непаслабны кантроль сталоўку, дамагаючыся сканчэньня дабставяньня яе і значнага палепшаньня грамадзкага харчаваньня і асабліва на час праполачнай і ўборачнай кампаніяй.

Дапамагчы ў рабоце ясьляў праз вылучэньне спэцыяльнай брыгады са складу дэпутацкай групы.

У гонар 3-й сэсіі ЦВК 10-га скліканьня наша дэпутацкая група арганізоўвае спаборніцтва на лепшы ўдзел усіх дэпутатаў у правядзеньні праполачнай і ўборачнай кампаній. Мы таксама прапануем арганізаваць усебеларускае спаборніцтва на дапамозе ўборачнай кампаніі і выклікаем на спаборніцтва дэпутацкія групы заводаў: «Чырвоны Мэталіст» (Віцебск), «Адраджэньне» (Магілеў), і «Пралетары» (Гомель).

Мы запэўніваем 3-ю сэсію ЦВК БССР, што пад кіраўніцтвам партыйнага калектыву свайго заводу і праз мабілізацыю ўсіх рабочых на барацьбу за свамчасовую і добраякасную ўборку ўраджаю з сацыялістычных палёў у гэтым спаборніцтве мы заваюем пярэдняе месца.

Старшыня дэпутацкай групы заводу «Камунар» АКУЦЁНАК.

Члены бюро групы: РОЗЭНБЭРГ, МІЛІЦКІ, ДУЛЬЦЫНА і АНДРЭЕВА.

Чырвонаштандарная рапартуе III сэсіі аб сваіх дасягненьнях

Дэпутацкая група чырвонаштандарнай гарбарні „Бальшавік" рапартуе III сэсіі ЦВК X скліканьня аб сваіх дасягненьнях, якія былі дасягнуты на аснове штодзённага ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў партыі і ўраду, пры непасрэдным кіраўніцтве парткалектыву

Чырвонаштандарная гарбарня «Бальшавік» у выніку ажыцьцяўленьня 6 гістарычных умоў тав. Сталіна і шырока разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва выканала прамфінплян і кварталу на 100 проц., а ў каштоўных адносінах—на 104,53, зьнізіла сабекошт на 8,26 проц. супроць пляну 2,94, павысіла прадукцыйнасьць працы на 113,59 проц., зьнізіла брак да 0,7 проц., плян экспарту клею выканала на 101 проц.

На заводзе шырока разгорнута работа па барацьбе за тэхніку, за асваеньне новых відаў вытворчасьці. Арганізуецца новы ўтыльцэх, які будзе з адыходаў вырабляць туфлі, баціінкі, балеткі. У кожным цэху існуюць гурткі па вывучэньні тэхнікі. Усе майстры заводу і частка астатніх работнікаў энэргічна вывучаюць новапрыбыўшую замежную машыну Вакумапарат.

У галіне рацыяналізацыі праароблена наступнае: арганізаваны па ўсіх цэхах рацыяналізатарскія бюро, якія шырока разгарнулі работу па зборы рабочых прапаноў. На 2-VII—32 г. было сабрана 350 прапаноў, частка з якіх ажыцьцяўляецца, частка яшчэ разьбіраецца. Завод сваячасова ўключыўся ў сталінскі паход, дамогся арганізацыі дадатковага загатоўчага пункту, ад ЗРК адкрыты дзьве калгасных крамы, арганізаваны трусатнік, дзе ёсьць ужо 90 трусоў. Шляхам самазагатовак палепшана якасьць абедаў.

На пазыку «4-га завяршаючага» на працягу 2,5 дзён рэалізавана пазыкі на 105 проц., дасягнута гэта было дзякуючы шырокай разгорнутай растлумачальна-масавай рабоце і разгортваньню сацспаборніцтва. Дэпутацкая група ў дамаганьні такіх посьпехаў была застрэльшчыкам і арганізатарам.

У далейшым абавязуемся, не здаючы тэмпаў ні на адну мінуту, дамагацца большага павышэньня прадукцыйнасьці працы, зьнізіць брак да 0 проц. на працягу III кварталу. Абавязуемся давесьці лік прагулаў да 0 ў самы хуткі тэрмін, на працягу 1 месяца цалкам асвоіць новы від вытворчасьці—машыну Вакумапарату.

Стварыць рацыяналізатарскія гурткі па вывучэньні тэхнікі, уцягнуўшы ў гэтыя гурткі ўсіх рабочых.

Усю работу надалей весьці ажыцьцяўляючы 6 умоў тав. Сталіна, мэтада мі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, павялічэньнем ліку гаспадарча-разьліковых брыгад, пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі.

Разам з гэтым дэпутацкая група гарбарні «Бальшавік» у дзень адкрыцьця III сэсіі ЦВК БССР бярэ шэфства: над пабудовай пасёлку «Камінтэрн», пракладкай трамвайнай лініі, дзе яшчэ мае месца значнае адставаньне, дзе яшчэ не ажыцьцяўлены цалкам 6 умоў тав. Сталіна. Яна абавязуецца перадаць свой вопыт даным пабудовам і дапамагчы ім выканаць плян будаўніцтва цалкам і ў тэрмін.

Мы выклікаем дэпутацкую групу гарбарні імя Сталіна (Магілеў), дэпутацкую групу Віцебскага скурзаводу і дэпутацкую групу ф-кі «Праца» (Гомель) узяць шэфства над камунальным будаўніцтвам, прасачыць і дапамагчы сваячасова скончыць пабудовы тых аб'ектаў камунальнага будаўніцтва, якія вызначаны партыяй і ўрадам для сканчэньня ў 1932 г.

Дэпутацкая група заводу «Бальшавік»

Прывітаньне тав. Сталіну

Табе, баявому саратніку і лепшаму вучню Леніна, правадыру слаўнай УсеКП(б) і сусьветнага пралетарыяту, прыяцелю, кіраўніку і настаўніку ленінскага камсамолу — VII Усесаюзная канфэрэнцыя УсеЛКСМ шле гарачае камсамольскае прывітаньне.

Запэўніваем цябе, тав. Сталін, што тэй справе, якой ты на чале ленінскага ЦК кіруеш, натхняеш, даеш пэрспэктывы, — гэтай справе, справе камунізму мы, ленінскі камсамол, аддамо ўсю энэргію, усе свае сілы і, калі па трабуецца, жыцьцё.

Ленінскі камсамол лічыць для сябе вялікім гонарам выконваць любое заданьне нашай партыі, адзінай партыі пралетарыяту.

Мы цьвёрда ўпэўнены, што пад тваім выпрабаваным кіраўніцтвам, на чале з ленінскім ЦК — пралетарыят і працоўныя масы СССР пабудуюць бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва і прыдуць разам з сусьветным пралетарыятам да канчатковай перамогі сусьветнай рэвалюцыі.

Няхай жыве баявы штаб камунізму — ЦК УсеКП(б)!

Няхай жыве правадыр бальшавізму — рулявы пралетарскіх перамог, кіраўнік і арганізатар жалезнай когорты ленінцаў, прыяцель, і настаўнік працоўнай моладзі — тав. Сталін!

МК УсеКП(б)—т. КАГАНОВІЧУ ЦК КП(б)—т. ГІКАЛО
Менгаркому КП(б)Б т. т. КАВАЛЬЧУКУ ШПЭКТАРАВУ
Моссавету т. т. БУЛГАНІНУ, СТРЫХ
ЦП машынабудаўніцтва—т. КАГАНОВІЧУ
БЕЛМЭТО—т. ЛЕВІНУ

РАПАРТ

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК. сацыялістычнымі мэтадамі працы—сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам рабочая клясе і калгаснае сялянства атрымліваюць перамогу за перамогай на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Атрыманы нашы машынабудаўнічым чырвонасьцяжным заводам імя К. Е. ВАРАШЫЛАВА ад Маскоўскага Савету унеплянавы заказ на сушыльны барабан, які раней увозіўся з-за межы і прадназначаны для работ па добрабыту Чырвонай сталіцы СССР—дзякуючы энтузіязму ударнікаў і ІТР пад кіраўніцтвам партыйнага калектыву—зроблены датэрмінова 1-га ліпеня 1932 г.

Гэтым рабочы калектыў заводу ўпісаў яшчэ адну пабеду на шляху да гнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны.

Заяраем партыю і ўрад, што мы варашылаўцы і падалей пойдзем па шляху сваечасовага і якаснага выкананьня астатніх 12 сушыльных барабанаў, якія прадназначаны для асноўных нашых гігантаў сацыялістычнай індустрыі—заводаў чорнай мэталюргіі.

Няхай жыве камуністычная партыя—арганізатар пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б.

Дырэктар заводу ВАЛАХНЯНСКІ
Сакратар калектыву КП(б)Б ІВАНОЎ.
Старшыня заўкому МІНКОВІЧ.

На VII усесаюзнай канфэрэнцыі УсеЛКСМ

2-га ліпеня раніцаю паседжаньне канфэрэнцыі пачалося з дакладу тав. Косарава, які падрабязна ахарактарызаваў становішча работы ў камсамоле, ўдзел камсамолу і моладзі ў сацыялістычным будаўніцтве. Свой даклад т. Косараў ілюструе лічбамі і фактамі з жыцьця работы моладзі ў нас, у Савецкім Саюзе, і ў капіталістычных краінах.

У нас, — гаворыць тав. Косараў, — беспрацоўя няма. У іх — у Амэрыцы і Эўропе — да 140 млн. беспрацоўных з сем'ямі. Кожны трэці чалавек — беспрацоўны.

— Гэтыя вынікі капіталістычнай сыстэмы на пяці шостых частках сьвету. А ў нас, у СССР, у чацьвертым завяршаючым годзе пяцігодкі адчувальна і ясна для рабочай і сялянскай моладзі, што беспрацоўя няма, што кожнага чакае работа на фабрыках, заводах, пашах і палёх. Гэта ілюструецца лічбамі выплаўкі чыгуну, сталі, выробу трактароў, аўтамабіляў, здабычы вугалю і нафты.

— Зарубежная рабочая моладзь разам з усім пралетарыятам адчуваюць на сабе ўдары крызісу капіталізму, які разбурае вытворчыя сілы, спрабуе кінуць чалавецтва назад да сярэднявякоўя. Аб гэтым красамоўна гавораць загашаныя 246 домнаў у Амэрыцы, 211 загашаных домнаў у Францыі і апошняя загашаная домна ў Аўстрыі.

— У нас лёзунг дня — пабольш тэхнікаў, інжынэраў, машын, у іх — наадварот менш тэхнікаў, менш машын. Яны заклікаюць да лапаты, мы-ж клічам да машыны.

— У нашых вышэйшых і сярэдніх школах навучаецца 1,200 тыс. чалавек, у пачатковых школах — 12 млн., у школах ФЗВ — 136 тыс. рабочай моладзі. Там-жа, у краінах капіталізму, закрываюцца ўнівэрсытэты, моладзь выкідаецца на вуліцу.

Пераходзячы да практычнай работы камсамолу, тав. Косараў гаворыць:— За тры з паловай гады пяцігодкі мы больш чым калі-небудзь з усёй рабочай клясай і працоўным сялянствам, пад кіраўніцтвам партыі, былі на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. Мы выявілі свае канкрэтныя штодзённыя справы з агульнымі задачамі міжнародняй пралетарскай рэвалюцыі. Наколькі вырасла значэньне нашай рабочай моладзі гаворыць наступныя лічбы: 46 проц. агульнага пралетарыяту складаюць маладыя рабочыя, 45 проц. моладзі сярод мэталюргіі. Няма такога галіны ў народнай гаспадарцы краіны, дзе-б рабочая моладзь не знаходзілася, ня прымала ўдзелу.

Далей тав. Косараў указвае на тыя новыя задачы, якія стаяць перад камсамолам. — Зараз задача заключаецца ў тым, каб змагацца з абязьлічкай камсамольскіх мэтадаў работы.

— Трэба ведаць сапраўднага ўдарніка, здолець адрозьніць яго ад лжэўдарніка. Улічваць працу маладога рабочага, якасьць і тэмпы ўдарніка — вось вузлавы момант далейшага руху сацыялістычнага спаборніцтва.

***

На вячэрнім паседжаньні, у другой частцы свайго даклада тав. Косараў падрабязна характарызуе работу камсамолу на вытворчасьці і на вёсцы і вызначае задачы камсамолу ў галіне выхаваньня і падрыхтоўкі новай пралетарскай інтэлігенцыі.

Свой даклад тав. Косараў заканчвае выказваньнем упэўненасьці, што ленінскі камсамол пад кіраўніцтвам партыі і яе ЦК на чале з тав. Сталіным ўпаўне справіцца з свайміі задачамі.

Да III сэсіі ЦВК

Больш увагі камунальнаму будаўніцтву

Камунальная і жыльлёвая гаспадарка ва ўмовах сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі павінна быць перабудавана ў адпаведнасьці тэмпам сацыялістычнай прамысловасьці, павялічэньню рабочае клясы і гарадзкога насельніцтва, росту бытавых і культурных запатрабаваньняў шырокіх працоўных мас. Аднак, трэба адзначыць, што гарадзкая гаспадарка яшчэ адстае ад тэмпаў узрастаючай прамысловасьці і становіцца тормазам нашага прамысловага і культурнага будаўніцтва.

Няспрыяючыя жыльлёвыя ўмовы зьніжаюць прадукцыйнасьць працы, ніспраўны транспарт зрывае нармальны ход вытворчасьці, дрэнная водазабясьпечанье адмоўна адбіваецца на здароўі насельніцтва.

У гарадох БССР камунальна—жыльлёвая гаспадарка яшчэ больш адсталая, чым у іншых савецкіх рэспубліках, бо тэрыторыя БССР больш падпадала нападу розных інтэрвэнтаў, асабліва белапольскіх банд, якія спалілі амаль што ўсе гарады, зруйнавалі жыльлёвы і камунальны фонд БССР.

На працягу апошніх год партыяй і савецкай уладай БССР праароблена вялізарная работа па аднаўленьні і рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі. Паваротным пунктам у разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі зьявіўся чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б), дырэктывы якога павінны быць ажыцьцёўлены ў якога павінны быць ажыцьцёўлены ў

Разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце ў пэрыяд першай пяцігодкі забясьпечыла пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў СССР і стварыла моцную базу для рашучага палепшаньня камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі. У бліжэйшым часе мы павінны дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны і ў галіне гарадзкой гаспадаркі. Такая воля камуністычнай партыі і рабочай клясы.

Пасьля кастрычніцкай рэвалюцыі мы дабіліся значных дасягненьняў у камунальна-жыльлёвым будаўніцтве БССР. Жыльлёвы фонд павялічыўся на 752,3 тысячы кв. м. У 1932 годзе мяркуецца ўвесьці ў эксплёатацыю 308 тысяч кв. м. жыллошчы, г. зн. 50 проц. усяго пабудаванага жылфонду. Такая шырокая праграма будаўніцтва ўскладае на гарсаветы і РВК вялікую задачу па перамаганьні ўсіх труднасьцяй, па снабжэньні будаўніцтва і будматар'ялам аддаць усе сілы і сродкі на выкананьне пляну.

У значнай меры павінна быць заваявана ўвага на выраб мясцовых будматар'ялаў і абсталяваньня, на выраб стандартных дамоў, на максымальную замену дэфіцытных матар'ялаў мясцовымі. У сувязі з гэтым на трэба фарсаваць і на працягу бліжэйшага часу скончыць пабудову заводаў па будматар'ялах і стандартных дамох. Патрэбна поўная мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў, ужываньне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, мэханізацыя і спрашчэньне будаўніцтва.

1932 год—заключны год пяцігодкі зьяўляецца базай надыходзячай другой пяцігодкі сацыялістычнай перабудовы камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі ў адпаведнасьці з разьвіцьцём прамысловасьці, у сувязі з гэтым мы маем тое, што колькасьць камунальных прадпрыемстваў (лазьні, пральні, водаправоды, электрастанцыі) за апошні час значна ўзрасьлі. Справа з лазьнямі была ў поўным заняпадзе і толькі ў апошнія часы пабудавана 12 лазьняў. Паводле пляну 1932 году прадугледжваецца пабудова яшчэ 45 новых лазьняў.

Па водазабясьпечаньні праароблена вялікая работа па рэканструкцыі старых водаправодаў. Пабудаваны 3 новых водаправоды. (Бабруйск, Полацак, Ворша). Колькасьць вады ў Менску павялічылася з 1728 куб. м. (у 1917 г.) да 7600 (у 1931 г.), а пры ўвядзеньні ў эксплёатацыю Навінкаўскай станцыі гэтая лічба падвоіцца. Паводле пляну 1932 году намечана пашырэньне старых водаправодаў і праектаваньне новых у Барысаве і Рэчыцы.

Як лазьні, так і водаправоды павінны быць забясьпечаны трубамі, выраб якіх зараз наладжваецца ў БССР. У Менску і Бабруйску абсталяваны цэхі для вырабу драўляных, а ў Магілеве ў новым чыгуна-ліцейным заводзе для вырабу чыгунных труб, і гэтым самым паслабляецца напружанасьць водаправоднага будаўніцтва.

У Менску пракладзена ў 1929 годзе каналізацыя, якая мае працягласьць 25 кілёмэтраў і ўключана ў яе 150 до маўладаньняў. У 1932 годзе намечана ўключыць яшчэ 300 домаўладаньняў. Адначасова праектуецца пракладка каналізацыі ў Гомелі і Віцебску.

Плянам 1932 году прадугледжвае павялічэньне асанізацыйнага абозу на 100 проц. Але справа гэтым не канчаецца. Патрэбна перабудаваць самую сыстэму ачысткі, рэканструяваць і заново стварыць ачысныя пабудовы. Нядбайныя адносіны да ачысткі з боку паасобных гарсаветаў і РВК павінны быць рашуча зломаны і ліквідаваны. Справа санітарнага становішча гарадоў павінна быць пастаўлена на належную вышыню, бо непаладжанае санітарнае становішча гарадоў стварае вялікую пагрозу для рабочага насельніцтва і тым самым перашкаджае сацыялістычнаму будаўніцтву.

Гарадзкі транспарт зьяўляецца адным са сродкаў арганізацыі спосабаў перавозкі рабочых да заводаў і фабрык, што зьяўляецца адным з фактараў, якія забясьпечваюць нармальную працу прамысловасьці і выкананьне прамфінпляну.

Трамвайны шлях пабудаваны ў Менску ў 1929 г. павялічыўся з 12 клм. да 38,3. У 1932 годзе мяркуецца пашырыць на 11 клм. шлях і давесьці колькасьць вагонаў да 95.

Аўтагаспадарка ёсьць у 8 гарадох з агульнай колькасьцю ў 60 машын, якія намечана ў 1932 годзе павялічыць на 163 новых аўтамашыны.

У апошнія гады значна палепшыўся гарадзкі добрабыт. Паступова павялічваецца плошча клінкерных і брушчатых брукаў, якіх ужо ёсьць каля 50.000 кв. мэтраў. Паводле няпоўных зьвестак за першую палову другога кварталу, ступень выкананьня камунальнага будаўніцтва нездавальняючая. Лепш за ўсё па БССР выкананьне будаўніцтва лазьняў (65 проц.), жыльля (44,5 проц.). Гэта гаворыць аб неабходнасьці перабудовы працы на выкананьне пляну работ 1932 году. Адставаньне паасобных гарсаветаў і РВК тлумачыцца няўменьнем выкарыстаць мясцовыя рэсурсы, недастатковай гаспадарчай гібкасьцю. У рабоце павінна быць праведзена бальшавіцкая барацьба за выкананьне пляну будаўніцтва 1932 году.

Органы камунальнай гаспадаркі павінны мабілізаваць усе свае сілы на выкананьне пляну 1932 году і на складаньне пляну другой пяцігодкі. Згодна дырэктыў XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б, на падставе ліквідацыі паразытных клясавых элементаў і агульнага росту народнага доходу, павінен быць дасягнуты больш хуткі ўздым дабрабыту рабочых і калгасных мас, і пры гэтым павінна быць дасягнута рашучае палепшаньне жыльлёвай і камунальнай справы ў БССР.

Толькі на падставе ажыцьцяўленьня ва ўсёй сыстэме камунальнай гаспадаркі 6 умоў тав. Сталіна правядзеньне рашучай барацьбы з правабартуністычнымі настроямі, «левымі» загібамі і прымірэньцтвам да іх, ужываючы сацыялістычныя мэтады

В. Нодэль

Міжнародны дзень каапэрацыі

Міжнародны Дзень Каапэрацыі зьяўляецца днём падтэкі сіл каапэрацыйнага руху ўсіх краін, праверкай таго, у якой меры рабочыя каапэратывы актыўна ўдзельнічаюць у барацьбе супроць капіталізму, за знішчэньне капіталістычнага нявольніцтва, за ўмацаваньне адзінага фронту пралетарскай барацьбы.

У гэтым годзе МДК рабочыя ўсіх капіталістычных краін сустракаюць на ўмовах нябачанага крызісу. Колькасьць беспрацоўных перавысіла 50 млн. Кожны новы дзень дадае да гэтых мільёнаў новыя дзесяткі тысяч. Колькасьць галадаючых расьце з кожным днём,—гэтага ня могуць схаваць і буржуазныя газэты ўсяго сьвету. За крываюцца ня толькі фабрыкі і заводы, закрываюцца школы, больніцы, ліквідуюцца рэшткі сацыяльных устаноў, заваяваных на працу многіх дзесяткаў год барацьбы рабочай клясы.

«Трэба прызнаць, што сучасны эканамічны крызіс зьяўляецца самым сурёзным і самым глыбокім крызісам з усіх існаваўшых да гэтага часу сусветных эканамічных крызісаў». Гэта ацэнка тав. Сталіна, даная два гады таму назад на XVI зьезьдзе партыі, у поўнай меры пацьвердзілася ходам разьвіцьця капіталістычнай гаспадаркі за апошнія два гады.

Нябачаныя разьмеры крызісу прымушаюць партыі II інтэрнацыяналу, сацыял-фашыстаў рознастайных колераў і рангаў зьмяняць фронт, высоўваць на перадавыя пазіцыі так званыя «левыя» элементы. Ня толькі аўстра-марксысты балбочуць аб асуджанасьці на пагібель капіталістычнай сыстэмы гаспадаркі, тое-ж самае робяць і пілсудчыкі. Яны імкнуцца пераканаць масы, якія іх хутка пакідаюць, у тым, што яны тады былі працўнікамі капіталістычнага спосабу вытворчасьці, што яны за сацыялізм, за выкарыстоўваньне мэтадаў будаўніцтва гаспадаркі, якія апраўдалі сябе на вопыце СССР. «Пшэлом», орган так званых «левых» пілсудчыкаў, гэтымі днямі пісаў:

«Савецкі вопыт павінен быў у першую чаргу давесьці, ці магчыма пляновая гаспадарка, якая кіруецца арганізацыямі вытворчаў-работнікаў бяз удзелу прадпрыемцаў. Вопыт аказаўся ўдалым без усялякага сумненьня»

Гэтыя сьцьвярджэньні робяцца для таго, каб паспрабаваць пераканаць шырачайшыя масы дробнай буркуазіі, сялянства аб тым, што пілсудчыкі здольны павесьці краіну па-новаму шляху без камуністаў, без зьвяржэньня ўлады капіталу.

Гэтыя «левыя» манэўры характэрны і для многіх правадыроў міжнароднага каапэрацыйнага руху. Выканком міжнароднага каапэрацыйнага альянсу ў прасекце рэзалюцыі да Міжнароднага Дню Каапэрацыі ня скупіцца на моцныя словы ў ацэнцы таго становішча, якое зараз у наяўнасьці. Ён піша аб катастрофе, якая напражае ўсяму сьвету, аб асуджанасьці капіталістычнай сыстэмы вытворчасьці. Але за гэтымі словамі няма ніякіх канкрэтных спраў. Адсюды заклік, які ёсьць у адозьве альянсу, зводзіцца да сьцьвярджэньня таго, што «адзіным сапраўдным спосабам перамаганьня сучаснага крызісу зьяўляецца сусьветнае ўжываньне прынцыпу каапэрацыі, дэмакратычнага кантролю вытворчасьці для спажываньня, а не для прыбытку і каардынаваньня вытворчасьці з спажываньнем, для якога адна толькі каапэрацыя дае здаровае эканамічнае абгрунтаваньне».

Каапэрацыйны альянс спрабуе адцягнуць увагу шырачайшых мас працоўных ад сапраўднага шляху барацьбы з крызісам. Ён паўтарае даўно выкрытую Марксам, Энгельсам і Леніным, усёй практыкай сусьветнай рэвалюцыйнай барацьбы тэорыю аб **асобным каапэрацыйным** шляху разьвіцьця, аб магчымасьці дабіцца пабудовы сацыялізму без зьвяржэньня ўлады капіталу, без дыктатуры пралетарыяту. Сусьветны вопыт на працягу многіх дзесяткаў год падцьвердзіў выключную правільнасьць ленінскага сьцьвярджэньня, што «палепшаныя, якія могуць быць дасягнуты пры дапамозе спажывецкіх таварыстваў, могуць быць толькі вельмі нязначны да таго часу, пакуль сродкі вытворчасьці знаходзяцца ў руках той клясы, без экспрапрыяцыі якой ня можа быць ажыцьцёўлены сацыялізм». Ленін указаў на тое, што «гэтыя таварыствы могуць атрымаць вялікае значэньне для эканамічнай і палітычнай маладай барацьбы пралетарыяту, падтрымліваючы рабочых у часе стачак, лёкаўтаў, палітычных прасьледваньняў і інш.».

Досыць прыглядзецца да лічбаў і фактаў работы спажыўкаапэрацыі капіталістычных краін за апошнія гады, каб лішні раз пацьвердзіць правільнасьць ленінскага сьцьверджаньня. Нямецкі саюз спажывецкіх каапэратываў перад сваім зьездам, які адбываўся ў чэрвені, апублікаваў справаздачу, імкнучыся давесьці, што па сутнасьці нічога ня здарылася, што каапэрацыя выходзіць з крызісу нават узмоцненай. Але вось некалькі лічбаў. Колькасьць членаў зьменшылася за апошні год на 100 тыс., зварот зьменшыўся больш чым на 25 проц. Пакупкі асобных членаў каапэрацыі зьменшыліся больш чым на чвэрць, уклады пайнікаў зьменшыліся амаль на трэцюю частку. Асабліва цікава тое, што закупкі каапэратываў у свайго цэнтру зьменшыліся ў большай меры, чым агульнае скарочаньне звароту. Гэта гаворыць аб тым, што асобныя каапэратывы спрабуюць знайсьці выхад з крызісу на шляхах узмацненьня сувязі з капіталістычнымі прадпрыемствамі).

Каапэрацыйны альянс лічыць за лепшае ня вельмі часта публікаваць параўнаўчыя даныя аб ролі і месцы спажыўкаапэрацыі СССР у сыстэме спажыўкаапэрацыі ўсяго сьвету. Ня гледзячы на тое, што ўсе каапэрацыйныя саюзы, якія ўнаходзяць у альянс, рэгулярна друкуюць свае справаздачы, дарат альянсу ня зводзіць іх, бо гэта невыгодна з пункту погляду палітыкі альянсу.

Паводле даных за 1930 г. у складзе членаў каапэратываў за адзін год (з 1929 па 1930 г.) удзельная вага СССР павялічылася з 69,3 да 75,8 проц., у зваротах усёй сусьветнай спажыўкаапэрацыі гэта ўдзельная вага павялічылася з 71,34 да 76,06; паявы капітал спажыўкаапэрацыі СССР склаў у агульнай суме каапэрацыі ўсяго сьвету ў 1929 г. 25,13, у 19.30 г.—35,42 проц., у зваротах усіх аптовых аб'яднаньняў зварот Цэнрасаюзу складаў у 1930 г. 86,38 проц.

1931 г. быў для савецкай спажыўкаапэрацыі годам нязмушаных далейшых посьпехаў. Таварэзварот павялічыўся на 6 млрд руб. (з 14.525 млн. да 20.512 млн.); колькасьць членаў павялічылася з 1-га студзеня 1931 г. па 1-е студзеня 1932 г. з 55 млн. да 74 млн. У гарадох мы фактычна заканчваем пагалоўнае каапэраваньне ўсяго дарослага насельніцтва (на 1-е студзеня 1932 г. было каапэравана 96 проц., у вёсцы ў гэтым годзе будзе каапэравана 80—85 проц. усяго дарослага насельніцтва).

У савецкай краіне мы менш за ўсё гаворым аб нашых посьпехах. Робім мы гэта не таму, што мы недаацэньваем іх значэньня, а таму, **што посьпехі гэтыя нас не здавальняюць.**

Таму і ў сёньняшні Міжнародны Дзень Каапэрацыі мы менш за ўсё будзем гаварыць аб тых дасягненьнях, якія мае спажыўкаапэрацыя ў цэлым і паасобныя яе зьвены. **У цэнтры ўвагі будзе стаяць пытаньне аб тым, чаго каапэрацыя ашчэ не зрабіла, у якой меры яна ашчэ не рэалізавала дырэктыў партыі аб перабудове работы ў сувязі з новымі задачамі, у якой меры спажыўкаапэрацыя сапраўды пераходзіць на рэйкі разгорнутага савецкага гандлю.**

Барацьба за зьнішчэньне недахопаў у рабоце спажыўкаапэрацыі і павінна скласьці цэнтральную задачу Міжнароднага Дню Каапэрацыі. Вырашыць гэтую задачу можна толькі пры ўмове, калі актыўнасьць саміх пайнікаў спажыўкаапэрацыі будзе значна падвышана, калі ўнутры кожнага каапэратыву будзе забясьпечаны ўдзел усіх яго членаў у наладжваньні вытворчасьці, калі каапэратыў будзе працаваць, як сапраўды масавая арганізацыя.

У МДК заслоўваў слай павінна быць падкрэсьлена ленінскае патрабаваньне аб неабходнасьці сапраўднага ўдзелу сапраўдных мас у рабоце кожнага каапэратыву. Праверка мэтадаў масавай работы, адпаведнасьць іх новай абстаноўцы, уменьне правільна расставіць сілы,—іменна вакол гэтых пытаньняў павінны быць у першую чаргу мабілізаваны шырачэйшыя масы рабочых і калгасьнікаў у МДК.

Партарганізацыі павінны выкарыстаць МДК для таго, каб усьвядомісьць усіх членаў партыі, камсамол, цаў. сав. работнікаў укараніць думку аб выключным значэньні рэзкага палепшаньня работы гандлёвага апарату на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба, каб усе работнікі гандлёвай сыстэмы зразумелі, што гандлёвая работа ня менш адказная, чым работа каля станка, што навучыцца добра гандляваць—важнейшая задача сёньняшняга дню. Узьняць аўтарытэт каапэрацыйнай работы, ліквідаваць такое становішча, пры якім людзі глядзяць на работу каапэрацыі як на часовую справу,—гэта значыць ударыць па цякучасьці, аслабіць гэту цякучасьць, дабіцца замацаваньня кадраў, іх росту, вылучэньня новых людзей.

Задача гэта будзе правільна вырашана толькі пры ўмове, калі ўсе мясцовыя партарганізацыі па-бальшавіцку возьмуцца за яе рэалізацыю. Адно з важнейшых указаньняў ЦК партыі—указаньне аб неабходнасьці ўсямернага ўмацаваньня партыйнага і прафсаюзнага кіраўніцтва ў сыстэме спажыўкаапэрацыі выконваецца надзвычайна дрэнна. Слабая перабудова магазыну, назыўнасьць у магазыне пакуль ня ляжа трэшчына...

Упружацца моцныя цягліцы рук, грудзі, сьпіны пры кожным удары:

— Г-гох!

Сонца пакрывае медзьдзю апаленыя рукі, плечы, шыю... Сыплецца ўдар за ўдарам. Горача. Пот праясьнае загарэлую скуру.

Лепшы ўдарнік камнябоец тав. КАРАБАНАЎ прэміяваны.

У другіх мясцох прахладней. На вялікіх глыбах камню пакойна сядзяць камнябойцы. Без сьпешкі крушэць таўстыя цыгаркі. Смачна цягнуць дым тытуню...

З-за лесу даносіцца нібы артылерыйскі стрэл—ірвуць камень.

З трэскам прусьцяць молаты камень на расчабёнку...

Тарарахаюць калёсы па ямках і калдобінах, падвозячы камень і пясок.

Брыгады мастаўшчыкоў кароткімі ланцужкамі пераходзяць паперок лінію, абмежаваную бардзюрам. Камень за камнем, шашку да шашкі, мэтр за мэтрам, пікет за пікетам...

Людзі рушацца ўперад, пакідаючы за сабой кілёмэтры каменнага бруку.

А на дарозе ўсё-ж прарыў. Тэмпы не адпавядаюць намечаным заданьням. Мастаўшчык дае два-тры пагонных мэтры...

З якога боку падыйсьці? Як знайсьці агульную мову? Дзе тое зьвяно, за якое трэба ўзяцца выяздной?

А першы прыём і тут халодны!

Насільшчыкі, падкідчыкі і насыпшчыкі...

Дзесятнікі...

Што ні чалавек—псыхіка. Што ні група—мапюнак поз і пераплёт настрояў. Што ні брыгада—комплекс асабістых інтарэсаў і імкненьняў...

Высока ўзьмётваецца молат плітаўшчыка і гулка адскоквае ад каменя пакуль ня ляжа трэшчына...

Сьпіна пакрывае медзьдзю апаленыя рукі, плечы, шыю... Сыплецца ўдар за ўдарам. Горача. Пот праясьнае загарэлую скуру.

Зашамацелі лісткі ў руках рабочых.

Пазуйце ўдарныя брыгады за ячэйку ў магазыне, за мясцком, гэта—барацьба за сапраўднае пераўтварэньне магазыну ў гаспразьліковае прадпрыемства, у такое прадпрыемства, якое зможа ня толькі добра прадаваць тавары, што прысылаюцца зьверху, але ў загатоўцы дадатковыя тавары на месцы.

Другая задача, якая з асаблівай сілай павінна быць выпячана ў МДК—гэта барацьба за рэалізацыю і выкарыстоўваньне мясцовых магчымасьцяй, скрытых рэзэрваў і рэсурсаў. Да гэтага часу і сыстэмы гандлюючых арганізацый і мясцовыя партарганізацыі не зрабілі ашчэ ўсіх неабходных вываду з рашэньняў XVII партканфэрэнцыі. А між тым канфэрэнцыя падкрэсьліла выключнае значэньне правільнай арганізацыі таваразвароту для мэт мабілізацыі скрытых рэсурсаў, якія ёсьць у дастатковай колькасьці ў нашай краіне. Барацьба за разгортваньне калгаснага гандлю, за мясцовыя загатоўкі, арганізацыю вытворчасьці на мясцох прадметаў шырокага спажываньня, лепшае выкарыстоўваньне таварных рэсурсаў, якія ёсьць у наяўнасьці,—усё гэта зьвеньні адзінага ланцугу барацьбы за павялічэньне таварных рэсурсаў, за палепшаньне рабочага спажываньня.

Мы нясумненна можам адзначыць значныя посьпехі «калгаснага гандлю. Іменна ў рэзультаце выхаду калгасаў, калгасьнікаў на базар павялічылася колькасьць прадуктаў на рынку, значна зьнізіліся цэны. Аднак тое, што мы маем зараз, ні ў якай меры ня вычэрпвае і дзесятай долі наяўных магчымасьцяй. Пакуль зробле на нямнога для таго, каб усе скрытыя рэзэрвы выдабыць, рушыць запасы сельгаспрадуктаў на гарадзкія рынкі. На спажывецкую каапэрацыю ляжа вялізарная адказнасьць за далейшы рост і ўмацаваньне калгаснага гандлю. Арганізуцца абслугоўваньня калгасаў, калгасьнікаў, аднаабонікаў, арганізацыя сустрэчнага гандлю, разгортваньне каапэрацыйнага гандлю прадуктамі харчаваньня,—усё гэта робіцца пакуль толькі ўрыўкамі, ад выпадку да выпадку, між тым, як патрабуецца сыстэматычная са дню ў дзень упартая работа.

Трэцяя задача—гэта работа над тым, каб ураджай гэтага году сустрэць новым буйным патокам прамтавараў. На другую палову 1932 г. у вёску будзе накіравана ня менш 55 проц. усіх прамтавараў. У трэцім квартале завоз на вёску будзе ў шмат разоў павялічаны ў параўнаньні з другім кварталам. Задача заключаецца ў тым, каб вялізарныя патокі тавараў, якія пойдуць у вёску, палі-бы па прызначэньні.

МДК мы праводзім ва ўмовах завяршэньня веснавой сяўбы. Наша краіна атрымала на веснавых палёх вялізарную перамогу. Ня гледзячы на недарод у радзе раёнаў, мы дабіліся таго, што недародныя раёны перакрылі пасеўны плян мінулага году і забясьпечылі ў гэтым годзе ўраджай значна больш, чым у мінулым годзе. Нашы перамогі на пасеўнай лішні раз прадэманстравалі найвялікшыя перавагі калектыўнай гаспадаркі Каб ня было ў нас калгасаў, мы-б ні ў якай меры не змаглі-б выканаць пасеўную праграму гэтага году пры тых стратах, якія былі ў мінулым годзе.



ЗРК № 5. Агульны вы гляд магазыну з нутры.

На базе калгаснай вытворчасьці, пры дапамозе МТС, разгортваючы саўгаснае будаўніцтва, савецкая краіна канчаткова замацавала вялізарнейшую справу нашай эпохі—справу пераводу дзесяткаў мільёнаў дробных таварных вытворцаў на шлях калектыўнай **вытворчасьці.**

МДК **супадае** з завяршэньнем сяўбы па **усёй** краіне. Міжнародны Дзень Каапэрацыі павінен быць выкарыстаны, як дзень самай шырокай падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі, як дзень мабілізацыі мас на лепшую арганізацыю поліва, падрыхтоўку ўсіх неабходных мерапрыемстваў для таго, каб добры ўраджай гэтага году быў-бы поўнасьцю рэалізаваны, тым самым забясьпечваючы далейшы ашчэ больш хуткі рост прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, забясьпечваючы сапраўды бальшавіцкую кустрэчу другой пяцігодкі.

Першы раз па лініі

Нельга сказаць, каб выяздная рэдакцыя зьявілася сюды жаданай госьцяй. У 9-ым вучастку дарбуду перад самым прыездам выяздной адбылася такая прыблізна гутарка:

— На дапамогу нам «Савецкая Беларусь» прысылае выяздную рэдакцыю...

— А на што яна?

— Ды ў нас жа прарыў!

— А ці яна паможа?

— Павінна дапамагчы!

— А я лічу...

Ня гледзячы на гарачае надвор'е і жаркае становішча з работамі на трасе, ад пытаньняў кіраўніка вучастку падыхала холадам:

— Нашто рэдакцыя? Без яе спакайней...

А яна ўсё-ж такі прыехала. Міма вушэй у газэтчыкаў прайшоў халадок начальніцкай гутаркі.

— Трэба ўвязацца ў бой, а там від на будзе!—Так разважалі працаўнікі рэдакцыі, седзячы ў сваёй паўтаратонцы, побач з амэрыканкай, на друкарскіх касах і рэдакцыйнай маемасьці. Рэдакцыя накіроўвалася паходным парадкам на лінію.

— Толькі-б правільна пусьціць у ход самую вострую, самую моцную!—вось што больш за ўсё займала работнікаў рэдакцыі. Амэрыканка стала пад прыкрыцьцем прытульнага доміка на высокім беразе рэчкі. У вялікім пакоі ляглі на падлозе друкарскія касы...

Грузавік, пазбавіўшыся цяжкай друкарскай машыны (амэрыканкі) і важкіх кас са шрыфтамі, пакаціўся ўсьцяж лініі...

Выяздная рабіла разьведку.

Квадраты кузаў паўтаратонкі скакалі па калюжынах і выбоінах аб'ездак, туляўся паміж дрэў і пнёў па лесе... Грузавік то наближаўся да самае трасы, нават пераходзіў з аднаго боку на другі, то адыходзіў далёка ў бок і сярдзіта завываў, калі калёсы «давалі букса» на мяккім балотным або пясчаным грунце.

Трас—гэта калейдаскоп малюнкаў. Чалавек апранае зямлю-балота і пясок—у каменную вопратку бруку. А гэтая вопратка патрабуе яго ножніцы іголкі з ніткай..

Камнябойцы, кольшчыкі, плітаўшчыкі, шчэбеншчыкі...

Мастаўшчыкі...

Возчыкі камня і пяску...

Першы ўдарнік брыгадзір Сьцяпан ЗАХАРАЎ.

У брыгадзе мастаўшчыкоў Калёскі імя газэты «Савецкая Беларусь» для ліквідацыі прарыву...

— Дайце встречный—планам строительства....

— Вступайте в социалистическое соревнование!

— 11 июля, день 12 годовщины освобождения БССР от белополяков, встретим полной ликвидацией прорывов в дорожном строительстве, выполнением программы строительства на участке прораба № 1!

Зашамацелі гутаркі па лініі. Узьвіхрыліся настроі па вучастку прараба № 1, які складаецца з тэхвучасткаў тт. Барэйшы і Грынько. На гэтым ад сталым, але важнейшым вучастку, сканцэнтравала сваю ўвагу выяздная рэдакцыя.

Дамагчыся датэрміновага сканчэньня дарогі на вучастку прараба № 1—такую задачу ўзяла на сябе рэдакцыя на нарадзе з кіраўніцтвам 9-та вучастку.

Адозва была кінута ў масы, каб узьняць перадавікоў, каб паклясьці пачатак ударніцтву і сацыялістычнаму спаборніцтву і павесьці барацьбу за тэмпы і якасьць.

Цяжка было зрабіць пачын. Перадавікі не адгукваліся. Работнікам рэдакцыі даводзілася чуць ранейшыя гутаркі супроць спаборніцтва...

Рэдакцыя занялася рэйдам па хар чаваньні. Грузавік выяздной спрабаваў езьдзіць за абедамі...

Нарэшце ідэй трэснуў. Першай адгукнулася брыгада мастаўшчыкоў тав. Русакова. Да яе далучыліся брыгады — Калёскіна і Белавусава. На тэхвучастку тав. Барэйшы быў зроблены пачын, хоць і нясьмелы.

У № 3 газэты «Савецкая Беларусь» на штурме прарываў у дарожным будаўніцтве» замест перадавога артыкулу быў відна пададзены выклік «ударнікаў імя газэты «Савецкая Беларусь» мастаўшчыкоў арцеляй — Русакова, Калёскіна і Белавусава:

— Мы обязуемся, напрягая все силы, ликвидировать прорыв, выполнить и перевыполнить планы строительства на нашем участке к 11 июля — дню освобождения Белоруссии от белополяков. Мы вызываем на социалистическое соревнование на лучшее и досрочное выполнение работ следующие артели: артель тав. Русакова вызывает артель тов. Зиновьева, артель Калескина — артель тов. Захарова, артель тов. Белоусова — артель тов. Чуракова...

Цяжка было паверыць, што гэта ёсьць сапраўдны пачатак спаборніцтва. Асаблівае сумняваньне выклікалі брыгады Калёскіна і Захарава.

Мастаўшчык брыгадзір Сьцяпан ЗАХАРАЎ.

— Бач, выклікае Калёскін Захарава... — прайшоў сьмяшок па лініі.

— Больш за ўсіх крычалі, а цяпер.: ці жартуюць ці ўсур'ёз?—дзівіліся другія.

— Якія там жарты? Справа — сур'ёзная! — рэзка заяўлялі больш сумленныя мастаўшчыкі і камнябойцы.

— Ці-ж у нас мала недахопаў? Бачце, па сталоўцы выяздная ўрэзала сваім рэйдам і інакш пайшла справа...

У № 4 газэты пад клішаванай шапкай—«Пад сьцягам ударніцтва» паведамлялася аб тым, што брыгада мастаўшчыкоў Іванова ў складзе чатырох асоб абвяшчае сябе ўдарнай брыгадай імя «Савецкай Беларусі» і выклікае на сацспаборніцтва брыгады Колышава і Лысякова.

Іскарка перакінулася на тэхвучастак т. Грынько. Цяжка было разьлічваць, каб гэтая іскарка лёгка ператварылася ў полымя. Але важна было ўжо тое, што на абодвых тэхвучастках прараба № 1 загаварылі пра газэту, пра першыя кроікі сацспаборніцтва.

Асабліва ўважліва чыталіся «чырвоная» і «чорная» дошка.

— Бригада Русакова (состоит из него и сына-ученика) при подноске камня дает 33 кв. метра булыжной мостовой хорошего качества на себя и сына, заносится на красную доску.

— Кольщик Гонгуль Иван дает ежедневно 7-8 метров шашки. За хорошее качество, очень добросовестное отношение к работе — заносится на красную доску.

Буйныя шрыфты, якімі надрукаваны былі «чырвоная» і «чорная» дошкі, прыцягвалі ўвагу рабочых па лініі.

На «чорную» быў занесены кольшчык Мільгуноў за п'янства. Рэдакцыя зьмясьціла і малюнак: п'яны сярод бутэляк за сталом... А пад кліше нават верш надрукавала:

...Прасьвістаў ён на прагуле
Грошы, порткі і кашулю
Засталося, мусі-быць,
Галаву яшчэ прапіць.

Рэдакцыя «травила негодное»... Аднак, па-рознаму ўспрыймалі рэзкі тон газэты ці лініі. Выскакавалі нават дакоры па адрасе рэдакцыі:

— Ну і што-ж, калі выпіў?

Некаторыя чухалі патыліцы. Адно было ясна, што ніхто не зайздросьціў Мільгунову. Не зайздросьціў ніхто і ўчкому Шаўдруку, які трапіў у газэтку (таксама з малюнкам) за зрыў сходу.

Перш чым скурыць газэту — большасьць на трасе рабочых яе чыталі ад першай літары да апошняй. Нават на подпісу рэдактара спыняліся.

— Который это редактор?

— Ды вунь той, што бяз шапкі...

— Ага, этот рыжанькай?! О, ён боевой!..

А ў № 5 брыгада тав. Колышава прымае выклік тав. Іванова і абвяшчае сябе ўдарнай імя газэты «Савецкая Беларусь»...

З свайго боку брыгада Колышава выклікае на сацспаборніцтва брыгаду Балашова Сяргея.

Колышаў мае ордэн чырвонага сьцягу. Яго ўдзел у сацспаборніцтва быў вялікім крокам наперад.

Аднак, не паведамленьне аб уступленьні ў сацспаборніцтва Колышава і нават не паведамленьне аб тым, што да 10 брыгад уступіла ў сацспаборніцтва па вучастку прараба № 1, былі прадметам агульнай увагі рабочых.

На тэхвучастку тав. Барэйша асабліва жывыя гутаркі ішлі вакол зводкі работ па гэтым вучастку і наконт клішэ:

— Впереди Русаков... 6 погонных метров на человека...

— За тое і зарапляні!

— Цягнік — Хвастунову... Яго брыгада другая па парадку, дае па 5,73 погонных мтр.

— Брыгадзе Чуракова — конь за 5,52 пог. мтр.

— Захараў.... сеў на чарапаху!

— Называецца... спаборнічаем!

— То-то і яно-то!..

— Эй, Захараў, бачыў? — насьмешліва пытаюцца суседзі.

Захараў сярдзіта даганяе малаткам шашку:

— Пачакай... Ты сядзеш...

— Не, я сяду!

Захараў — камсамолец. Нібы сапрапаўзла па яго целе. Шмат-то нянры емнае шкрабнула па яго камсамольскім нервам... Нервы... Нервы... Нервы...

— Пабачым, хто апошні? Змыць с сябе пляму! Зьлезьці з чарапахі!

Падвярнуліся работнікі рэдакцыі, за газарылі з Захаравым пра тэмпы. І... Сьцяпан Захараў узьнімае пытаньне аб арганізацыі нядзельніка штурму прарываў на тэхвучастку тав. Барэйшы.

Выяздная рэдакцыя выпускае заклік тав. Захарава асобнай лістоўкай:

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

ВСЕ НА ШТУРМ ПРОРЫВОВ!

Мы, стаханаўцы нашае вызыка брыгады Захарова и отдела прыгады Колесникова, учитывая чрезвычайную важность их предложения, приглашаем всех мастаўшчыков и каменебойцев участка всем как одна выйти на воскресник или отд. «Савецкая Беларусь» по ликвидации прорывов на дорожном строительстве.

Ко всем рабочим участка техника т. Борейша.

ТОВАРИЩИ!

Мы работаем неплохо. Но все-же на нашем участке—недопустимый прорыв, который во что бы то ни стало должен быть ликвидирован в самое ближайшее время.

Учитывая необходимость быстрейшей ликвидации прорыва в дорожном строительстве и ускорения темпов работы, бригада мастаўшчыков т. Захарова, в добровольном соревновании вызывает 26 июня воскресник.

Мы обязуемся в этот день работать так же ударно, как и всегда.

Вызываем последовать нашему примеру всех рабочих участка техника т. Борейша.

В частности, вызываем бригаду т. Колесникова.

Бригадир: ЗАХАРОВ.

Бригада т. Колесникова ответила на вызов бригады т. Захарова и обещала всем составом выйти на работу в воскресенье 26 июня.

Ударніцтва і сацспаборніцтва ўзьнімаецца на вышэйшую ступень. На тэхвучастку тав. Барэйшы разгарнулася падрыхтоўка да масавага нядзельніка.

Рэдакцыя крок за крокам заваёўвае аўтарытэт сярод рабочых...

(Працяг будзе).

М. Калінін

Аб умацаваньні кіруючых кадраў калгасаў

Перавага калектыўнай сельскай гаспадаркі перад індывідуальнай цяпер ужо даведзена доўгаю практыкаю. Калгас, дзе кіраўніцтва мала-мальскі адказвае інтарэсам калгаснай гаспадаркі,—там прадукцыйнасьць працы вырастае мінімум на 20—30 проц. у параўнаньні з індывідуальнай гаспадаркай. І таму пытаньні кадраў, прынамсі асноўных кадраў—старшыня, праўленцы, брыгадзіры,—маюць рашаючае значэньне ў посьпехах калгаснай работы.

Ул. І. Ленін у наказе Савета працы і абароны мясцовым савецкім установам дасьціла падкрэсьліваў неабходнасьць пашырэньня кола дзяржаўных працаўнікоў па гаспадарчым будаўніцтву. «Цяпер,—гаварыў Ленін,—«гаспадаром» зьяўляецца рабоча-сялянская дзяржава, і яна павінна пастаўіць шырока, плянамерна, сыстэматычна і **адкрыта** справу падбору найлепшых работнікаў па гаспадарчым будаўніцтву, адміністратараў і арганізатараў спэцыяльнага і агульнага мясцовага і агульнадзяржаўнага маштабу» (Ленін, т. XVIII, ч. I, стар. 245).

Пастанова Наркамзему і Калгасцэнтру Саюзу ССР аб умацаваньні кіруючых кадраў калгасаў, апублікаваная 6 мая і зацьверджаная ЦК партыі, іменна адказвае ўказаньням Леніна і жыцьцёвай патрэбе ў кадрах калгасаў сёньня. Нажаль, друк, мне здаецца, слаба рэагаваў на гэтую пастанову; між тым яго ўмелае практычнае правядзеньне ў жыцьцё, бязумоўна, дасьць добрыя рэзультаты.

Кіраўніцтва калгасам—вельмі цяжкая задача, яна ад старшыні патрабуе многіх якасьцяй. Па-першае, старшыня павінен уладаць дастатковымі аўтарытэтам, каб яго распараджэньні выконваліся ня толькі, як распараджэньні старшыні, але і як палітычнага і гаспадарчага аўтарытэту. Падругое, ён павінен ўладаць гаспадарчым вопытам, ці, напрыклад, арганізатарскімі здольнасьцямі. Па-трэцяе, ён павінен ўладаць вялізарным цярпеньнем, ня траціць самаабкладаньня ад вялізарнай колькасьці дробных нараканьняў. І самае галоўнае—быць добрым палітыкам-практыкам. Калі калгас знайшоў такога чалавека, зразумела, абавязак ўсіх вышэйшых органаў берагчы яго, паступаць па-ленінску, г. ё. дапамагаць росту такога кіраўніцтва.

Чаму старшыня калгасу павінен уладаць апроч гаспадарчых здольнасьцяй ашчэ і палітычным чуцьцём, разумець лінію партыі? На гэта можна адказаць агульнавядомай думкай; у Савецкім саюзе можна кіраваць чым бы там ні было (завод, саўгас, раён ці вобласьць) толькі пры актыўнай падтрыманасьці з боку мас (партыя, прафсаюзы, камсамол і г. д.). У калгасе справа складаней, там яшчэ не аджылі старыя сацыяльныя праплас тоўкі. Значная колькасьць пажылых людзей ашчэ не разьвязаліся з рэлігійнымі забабонамі, ім процістаіць камсамол, якому зьяўляюцца дзікімі, чужымі гэтыя забабоны. Стварыўся вельмі значны пласт людзей, у тым ліку і жанчыны, якія бачуць сваю будучыню ў разьвіцьці калгасу, зьяўляюцца барацьбітамі - патрыётамі за калектывізацыю; ім процістаіць пра пластоўкі, якія прышлі ў калгас пад грамадзкім узьдзеяньнем, у якіх ашчэ жыве думка: «А можа-быць усё гэта часова». Вялізарнай колькасьці працоўнага калгаснага насельніцтва проці стаіць, па сучаснай тэрміналёгіі, гуль таі, якія імкнуцца выкрыцьцём ад работы і быць першымі пры падзеле рэзультатаў працы.

Роля праўленьня, старшыні калгасу—аб'яднаць перадавыя сілы калгасьнікаў і, абапіраючыся на лепшыя калгасныя элементы, ператварыць усю гэту масу ў эфэктыўны вытворчы калектыў. Ясна, што для гэтага патрэбна вялізарная палітычная работа. Цяпер ужо прызнана найбольш прадукцыйнаю брыгадная сыстэма работ. Вазьмеце расьпісаньне людзей па брыгадах,—колькі труднасьцяй еу стракаецца тут на шляху. Па-першае, удалыя, спрытныя работнікі імкнуцца зьбіцца ў адну брыгаду. Старшыня-ж кіруецца агульнымі інтарэсамі калгасу. Ён павінен мець довады, практычную необходнасьць злучаць спрытных работнікаў са слабымі. Ма ла таго, так склаўшы брыгады, каб кожная з іх была працаздольна. Разь каляваньне коняй. З паўсотні калгасных коняй заўсёды ёсьць пяць вельмі добрых, пяць дрэнных. Кожная брыгада хоча атрымаць добрых. Уявім сагда, што старшыня, што брыгада Іванбе, што старшыня, што брыгада Іванова неасьцярожна абыходзіцца з коньмі, любіць шпарка ездзіць і накладаць вялікія вазы. Зразумела, ён, як добры гаспадар, дае ім найбольш мяккіх, не гарачых коняй, якіх не вельмі трывожыць бізун. Колькі трэба аўтарытэту, каб брыгады ўнутрана пагадзіліся з такім разьмеркаваньнем, зробленым старшынёю. І так па кожным пытаньні.

Найбольш востра стаіць разьмеркаваньне прадуктаў.

У першую чаргу людзі павінны атрымаць за сваю працу, за яе колькасьць і за якасьць. Здаецца, справа простая: атрымліваў поўнасьцю, што выпрацаваў, і ўсё па ўсім; але гэтак толькі іменна здаецца. Перад разьмеркаваньнем стаяць два чалавекі, у абодвых па дзьвесьці працадзён, але ў аднаго сям'я з шасьці чалавек маленькіх, у другога—ён адзін, а між тым калгасьнікі за сваю работу ў значнай ступені атрымліваюць натурай. Калі яны атрымаюць па роўнай колькасьці адных і тых жа прадуктаў, будуць абодва незадаволены. Відавочна, адзін будзе стаяць на тым, каб яму далі больш хлеба, бульбы; другі будзе больш патрабаваць мяса, вопраткі, ласункі і г. д., г. ё., каб іх рэзультат работы, ацэньваючыся ў натуральных прадуктах (хоць бы і неадпалкавых) адпавядаў запраўдным працаднём. Вось тут ужо патрабуецца вялізарная гнуткасьць ня толькі старшыні, а і мясцовага каапэратыва, які павінен знайсьці формы зрадаваленьня таго і іншага боку.

Далей мне хацелася-б зьвярнуць увагу ашчэ на адзін важнейшы бок разуменьня калгаснай работы, а імен на—адчуваць яе сувязь з сацыялістычнай дзяржавай. Мне прыходзілася спатыкаць старшынь, якія вельмі добра вядуць калгасную работу і цалкам ёй аддаюцца. Выслухаўшы дасягнутыя посьпехі, задаеш яму пытаньне:—Ну, вось, вы ўжо наладзілі малочна-таварную фэрму, захавалі індывідуальную жывёлу ў калгасьнікаў; а ці пачалі вы здаваць малако па кантрактацыі? — «У на, — адказваюць мне,—узімку малака нямнога, думаем летняй дойкай усё выканаць, а цяпер трацім на свае патрэбы». Калі яму растлумачыш, што вось іменна гэткая практыка ёсьць не сацыялістычная, не дзяржаўная, што дзяржава траціць вялізарныя сродкі, у тым ліку і валюту, якая з такой труднасьцю здабываецца дзяржавай, на пабудову заводаў трактарных, сельскагаспадарчых прылад і што іменна горад, рабочыя ўзімку больш адчуваюць патрэбу ў малочных прадуктах, шчыра зьдзіўляецца:—Як гэта я аб гэтым не падумаў ды і ў раёне мне так ясна і проста пытаньне не ставілі. Трэба-б мне падвучыцца, ды ня пускаюць.

Усе гэтыя факты лішні раз падкрэсьліваюць неабходнасьць разгортваньня работы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы калгасных кадраў. Гэта азначае, што мы павінны фарсаваць ажыцьцяўленьне ўказаньняў тав. Сталіна аб тым, каб сьмялей вылучаць на камандныя пасады практычных натхніцеляў і арганізатараў на тых ці іншых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, «даць ім магчымасьць правяць свае арганізатарскія здольнасьці, даць ім магчымасьць папоўніць свае веды і стварыць ім адпаведныя абставіны, не шкадуючы на гэта грошы».

На калгасы нельга гл

Заутра 9-ты год канстытуцыі СССР

СССР-створан воляй працоўных усіх нацыянальнасьцяй

Толькі ўлада саветаў, толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, згрупаваўшай вакол сябе большасьць насельніцтва, аказалася магчымым зьнішчыць у корані нацыянальны ўціск, стварыць абстаноўку ўзаемнага давер'я і закласьці асновы брацкага супрацоўніцтва народаў".
(З дэкларацыі аб стварэньні СССР).

Найлепшае ўмацаваньне нашай канстытуцыі—паскаленьне тэмпаў чацьвертага завяршаючага году пяцігодкі

Дзевяць год канстытуцыі СССР

6 ліпеня канчаецца 9 год з дня зацьверджаньня II сэсіяй ЦВК Саюзу ССР 1 склікальня канстытуцыі Саюзу ССР, ці асноўнага закону аб савецкім дзяржаўным ладзе і кіраўніцтве.

Саюз савецкіх сацыялістычных рэспублік створаны воляй працоўных усіх нацыянальнасьцяй, якія насяляюць вялізарную тэрыторыю СССР.

Канстытуцыя наша поўнасьцю выражае задачу брацкага сужыцьця і супрацоўніцтва паасобных народаў на аснове поўнага роўнапраўства і аб'яднаньня сіл працоўных усіх нацыянальнасьцяй для пабудовы сацыялізму. «Толькі ўлада саветаў, толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, згрупаваўшай вакол сябе большасьць насельніцтва, аказалася магчымым зьнішчыць у корані нацыянальны ўціск, стварыць абстаноўку ўзаемнага давер'я і закласьці асновы брацкага супрацоўніцтва народаў» (З дэкларацыі аб стварэньні Саюзу ССР).

Ажыцьцяўляючы прынцыпы нацыянальнай палітыкі, савецкая ўлада разьвівае і ўмацоўвае савецкую дзяржаўнасьць у формах, адпавядаючых нацыянальна-бытавым умовам паасобных народаў, якія насяляюць СССР, разьвівае і ўмацоўвае дзейнічаючыя на роднай мове насельніцтва суд, адміністрацыю, органы гаспадаркі, школу, тэатр, прэсу, літаратуру, мастацтва і т. д., рыхтуе кадры спэцыялістаў па ўсіх галінах тэхнікі й культуры з ка рэннага насельніцтва, з людзей, якія ведаюць быт і патрэбы свайго народу. Ажыцьцяўляючы гэтыя задачы ў галіне нацыянальна - тэрытарыяльнага будаўніцтва, савецкая ўлада побач з будаўніцтвам мбуйных нацыянальна - тэрытарыяльных аб'яднаньняў шырока праводзіць будаўніцтва нацыянальных раёнаў і паасобных сельскіх саветаў там, дзе сярод мясцовага насельніцтва пераважае тая ці іншая нацыянальная меншасьць. У сучасны момант у Саюзе ССР налічваецца 16 аўтаномных рэспублік, 17 аўтаномных вобласьцяй, 242 нацыянальных раёны і 5.266 нацыянальных саветаў.

Посьпехі нацыянальнага адміністрацыйна - тэрытарыяльнага будаўніцтва спрыяюць шпаркаму гаспадарчаму росту і далейшаму росквіту культуры паасобных народаў Саюзу ССР, культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце.

Пры ўдзеле працоўных усіх нацыянальнасьцяй Саюзу ў нас пераможна праводзіцца культурная рэвалюцыя, асабліва сярод адсталых нацыянальнасьцяй Усходу, які былі амаль наголоўна няпісьменнымі, ці малых народаў Поўначы, якія былі на ўсе 100 проц. няпісьменнымі. Цяпер мы маем па ўсіх нацрэспубліках, вобласьцях і раёнах і нават «вядзьведжых кутках» цэлую сетку ўстаноў асьветнага і культурнага характару.

Возьмем Узьбекістан. Да рэвалюцыі ва Узьбекістане было 1—2 проц. пісьменных, для карэннага насельніцтва ня было школ, калі ня брать у лік рэлігійных. Зараз агульная пісьменнасьць насельніцтва дасягнула 50—60 проц., ва Ўзьбекістане ажыцьцёўлены ўсенавуч. У 1932 годзе ў рэспубліцы працае каля 5 тыс. школ з 500 тыс. вучняў.

У Кіргізіі да рэвалюцыі было 70 пачатковых школ, агулам на 100 камплектаў, у канцы 1931 г. было 900 школ агулам на 2044 камплекты; ліквідавана безграмотнасьць у 1931 г. было ахоплена 250 т. чалавек.

У 1931-32 навучальным годзе пачата ажыцьцяўленьне ўсенавуча па ўсёй рэспубліцы. У 1933 годзе Кіргізія стане краінай суцэльнай пісьменнасьці.

Па Чувашыі да 6 ліпеня (12 годзьдзе рэспублікі) ажыцьцяўляецца суцэльная пісьменнасьць насельніцтва (да Кастрычніка было пісьменных 18 проц.).

Па Татарыі ў 1931 г. ёсьць 3025 школ І-й ступені (да рэвалюцыі было 55 пачатковых школ), 482 школы для падлеткаў, 116 школ 2-й ступені і 14 вышэйшых навучальных устаноў. У 1932 г. арганізуецца яшчэ 7 новых ВНУ.

У Азэрбайджане ахоп дзяцей ўсена вучам дасягае 90 проц.

У Карэліі ахоплена навучаньнем 94 проц. усіх няпісьменных, у Мардоўскай вобласьці — 93 проц.

Дзень канстытуцыі павінен паслужыць для ўмацаваньня магутнасьці і абароназдольнасьці нашай краіны, нагадваючы, што і ў прамадзянскай вайне мы перамаглі дзякуючы таму, што нам удалося «стварыць абстаноўку ўзаемнага давер'я і закласьці асновы брацкага супрацоўніцтва народаў». Мы цяпер гэтае брацкае супрацоўніцтва народаў разьвілі значна далей, маючы буйныя рэзультаты, калі рад нацыянальных рэспублік ператвараецца з адсталых аграрных у перадавыя аграрна - індустрыяльныя.

Самаахвярная адданасьць партыі і яе ленінскаму ЦК, бязьлітасная барацьба з правымі ўхіламі, як галоўнай небясьпекай і «левымі» загібамі ў практыцы работы, дакладнае і нястомнае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду, непарушэньне канстытуцыі Саюзу ССР і ўмацаваньне рэвалюцыйнай законасьці, — вось чым усе працоўныя савецкай краіны павінны адзначыць дзень 6 ліпеня — гэтую гістарычную дату ў жыцьці ня толькі народаў Саюзу ССР, але і працоўных усяго сьвету.

У барацьбе двух сьветаў: загніваючага, спліваючага жоўцю і атрутай капіталізму, і маладога, мацнеючага і гігантскі ўзрастаючага сацыялізму, перамога — за сацыялізм.

Капіталістычны сьвет марна намагаецца затрымаць разьвіцьцё рэвалюцыйнага духу. Крывавым тэрорам супроць рабочых і сялян і мільёнаў калёніяльных рабоў, рэжымам нявыказнага прыгнечаньня нацыянальных меншасьцяй капіталісты і іх лёкаі спрабуюць сумеснымі сіламі і ўсімі сродкамі, аж да арганізацыі інтэрвэнцыі, разбурыць апору ўсясьветнай рэвалюцыі — Саюз савецкіх сацыялістычных рэспублік.

Пад кіраўніцтвам партыі саветы павінны яшчэ вышэй узьняць актыўнасьць мас, умацоўваць абарону краіны, узмацняць у сваёй штодзённай рабоце клопаты аб Чырвонай арміі, павялічваць яе баявую магутнасьць, забясьпечваць поўную незалежнасьць нашай краіны ад замежнай тэхнікі,—ім парту, абсталяваньня і машын, пакрыць і перакрыць пазыку «чацьвертага завяршаючага году пяцігодкі», выконваць і перавыконваць свае прамфінпляны на кожным заводзе, у кожным калгасе скончыць пяцігодку ў чатыры гады і прыступіць да ажыцьцяўленьня другой пяцігодкі — пяцігодкі пабудовы сацыялізму. Такія задачы.

Дзень канстытуцыі гэта ня толькі сьвята народаў СССР, гэта — сьвята працоўных і прыгнечаных усяго сьвету, якія бачаць у СССР вызмоўную цьвярдыню супроць сусьветнага імпэрыялізму.

С. Дымаштэйн.

Канстытуцыя брацкага супрацоўніцтва і салідарнасьці народаў СССР

У гэтым годзе мы сьвяткуем дзень канстытуцыі Саюзу ССР ніпярэдадні вынаньня першай пяцігодкі ў чатыры гады. У рэзультаце агромнай вялізарнейшых труднасьцяй, ужываньня сацыялістычных форм працы — сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, — энтузіязму рабочай клясы і масы калгасьнікаў, мы пусьцілі ў хот рад гігантаў прамысловасьці і ператварылі Савецкі Саюз у краіну самай буйнай сельскай гаспадаркі. Мы атрымалі рашаючую перамогу таму, што цьвёрда праводзілі ў жыцьцё генэральную лінію наша партыі пад кіраўніцтвам яе ленінскага ЦК. Няма ніякіх сумненьняў, што задача «дагнаць і перагнаць» перадавыя капіталістычныя краіны будзе намі выпрашана цалкам і поўнасьцю, а часткова ўжо выпрашана ў радзе вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва.

У краінах капіталіу, наадварот, мы бачым крызіс, які бесьперапынна паглыбляецца. Расьце беспрацоўе, скарачаецца вытворчасьць, гарадзі і цэлыя дзяржавы ператвараюцца ў банкротаў. Надзвычайна абвастраецца супярэчнасьці паміж капіталістычнымі краінамі. Рэцэпты знахароў ў капіталізму ло пнюцца, як бурбалкі ў дождж. Высьветлілася поўная бездапаможнасьць і недалужнасьць намог буржуазнай гаварыльні «Лігі нацый» вылячыць дужне ўзьнішоўшы на шлях шыцьця капіталізм. Зацюнутыя ў абцуці жорсткага сусьветнага эканамічнага крызісу, імпэрыялісты шукаюць паратунку ў новай сусьветнай вайне, узмоцнена рыхтуючыся да нападу на Савецкі Саюз. Побач з гэтым, у краінах капіталізму расьце рэвалюцыйны рух, пралетарыят выходзіць на вуліцу і вядуць упартыя клясавыя баі.

Такая расстаноўка сіл да дню канстытуцыі Савецкага Саюзу.

У краіне саветаў — сацыялістычны росквіт, яскравыя дасягненьні распадарчага і культурнага будаўніцтва кідаюцца кожнаму ў вочы. У краінах капіталу — распад, страх, няўпэўненасьць ў заўтрашнім дні. Дзень канстытуцыі СССР зьяўляецца сьвятам працоўных ня толькі нашага Саюзу, але і ўсяго сьвету.

Дасягненьні нашы спрыяюць рэвалюцыйнаму ўздыму сярод рабочых усяго сьвету для барацьбы за вызваленьне з-пад капіталістычнага ярма. Савецкі саюз зьяўляецца «прообразом» будучага сусьветнага Саюзу савецкіх дзяржаў. Ён зьяўляецца новай, савецкай формай сужыцьця народаў у рамках адзінай дзяржавы. Вырашэньне важнейшых гаспадарчых пытаньняў магчыма толькі пры дружным супрацоўніцтве працоўных усіх нацыянальнасьцяй злучаных у адну інтэрнацыянальную сям'ю. Вырашэньне нацыянальнага пытаньня, аб'яднаньне волі, творчай энэргіі і сіл працоўных усіх нацыянальнасьцяй, магчыма толькі пры перамозе пралетарскай рэвалюцыі, пры дыктатуры пралетарыяту. Савецкая-ж сыстэма ёсьць дзяржаўная форма дыктатуры пралетарыяту. Мы знаходзімся і знаходзімся ў варожым буржуазным абкружэньні, пад пастаянай пагрозай ваеннай інтэрвэнцыі і эканамічнай блёкады з боку імпэрыялістаў, і нам прыходзіцца будаваць сацыялізм з разьлікам выключна на свае рэсурсы. Нам трэ' было дабіцца адзінага непарушнага фронту працоўных усіх нацыянальнасьцяй савецкіх рэспублік для ўзгодненай плянавай пабудовы сацыялізму, а гэтага можна было дасягнуць толькі шляхам арганізацыі Саюзу сацыялістычных савецкіх рэспублік.

Саюз ССР узьнік зусім добраахвотна. Яшчэ да фармальнага аб'яднаньня савецкіх рэспублік паміж імі ўстанавілася супрацоўніцтва ў галіне ваеннай і гаспадарчай. З моманту свайго ўзьнікненьня савецкім рэспублікам прыходзіцца весьці барацьбу, як з унутранымі контрэвалюцыйнымі элемэнтамі, так і з сіламі міжнароднай контрэвалюцыі і наладжваць гаспадарку, якая канчаткова развалілася ў рэзультаце імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны. Гэтая барацьба з контрэвалюцыяй і за аднаўленьне гаспадаркі патрабавала вялізарных намог. У гэтых умовах і была закладзена аснова супрацоўніцтва асобных савецкіх рэспублік. За дачы далейшага разьвіцьця і ўмацаваньня савецкіх рэспублік і абароназдольнасьці краіны патрабавалі нашы рэньня і паглыбленьня супрацоўніцтва паміж паасобнымі рэспублікамі.

Аднаўленьне разбуранай гаспадаркі, сацыялістычная перабудова яе, заўзятае супрацьўленьне капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі ў кожнай з савецкіх рэспублік, неабходнасьць аказаньня рэальнай дапамогі нацыянальнасьцям, найбольш адсталым гаспадарча і культурна, неабходнасьць пад цягнуць іх і, такім чынам, забіцца фактычнае роўнасьці, патрабавалі яшчэ большага пашырэньня і ўмацненьня супрацоўніцтва паміж асобнымі савецкімі рэспублікамі.

Канстытуцыя СССР зьяўляецца вынікам і афармленьнем добраахвотнага супрацоўніцтва працоўных усіх савецкіх рэспублік, вызначаючы ў тэй-жа час мэты і імкненьні Савецкага Саюзу і даючы праграму яго дзеяньняў.

Наша канстытуцыя — зброя пралетарскай дыктатуры для падаўленьня капіталістычных элемэнтаў і для абароны інтарэсаў працоўных усіх нацыянальнасьцяй СССР.

У капіталістычных краінах канстытуцыя разглядаецца, як нешта такое, што стаіць над дзяржавай і тым самым замаскіроўваецца клясавая сутнасьць буржуазнай дзяржавы.

У нашай канстытуцыі проста сказана, што яна «мае сваёй задачай гаранаваць дыктатуру пралетарыяту ў мэтах падаўленьня буржуазіі, зьнішчэньня эксплёатацыі чалавека чалавекам і ажыцьцяўленьня камунізму, пры якім ны будзе ні падзелу на клясы, ні дзяржаўнай улады».

У канстытуцыях буржуазных краін шмат гаворыцца аб «дэмакратыі», аб «свабодах», аб «роўнасьці» і г. д., і г. д., але нічога аб зьнішчэньні эксплёатацыі чалавека чалавекам. Усе гэтыя «дэмакратычныя свабоды» буржуазных дзяржаў створаны і існуюць толькі для заможных клясь, якія глядзяць на дзяржаўную ўладу, як на зброю для зьнабаленьня і рабства мільёнаў працоўных.

Асноўнай задачай пралетарскай дзяржавы зьяўляецца пабудова камуністычнага грамадзтва. Гэту задачу працоўныя Савецкага саюзу ажыцьцяўляюць разгорнутым сацыялістычным будаўніцтвам і наступам на капіталістычныя элемэнты. Нашае сацыялістычнае будаўніцтва пакавае працоўным усяго сьвету перавагу сацыялістычнай сыстэмы над капіталістычнай і ўказвае ім, што адзіна магчымым выхадам з галечы і выміраньня зьяўляюцца пралетарская рэвалюцыя і ўстанаўленьне дыктатуры пралетарыяту. Нашы дасягненьні рэвалюцыянізуюць працоўных усяго сьвету і мабілізуюць іх на барацьбу з капіталізмам.

Працоўныя Савецкага саюзу сустракаюць гадавіну канстытуцыі ў поўнай гатоўнасьці далейшага яе ўмацаваньня. Найлепшым-жа ўмацаваньнем нашай канстытуцыі будзе ўзмацненьне тэмпаў завяршаючага году пяцігодкі і падвышэньне абароназдольнасьці краіны Саветаў.

Сім. Такоеў.

Аб прэміяваньні калгасу „Гігант"

Пастанова Праўленьне Калгасцэнтру і Наркамфіну БССР

Калгас «Гігант», Халопенскага сельсавету, Крупскага раёну, пасьпяхова правёў пасеўкампанію, выканаўшы плян сяўбы на 108 процантаў, пасьпяхова праводзіць праполачную і сена ўборачную кампаніі. Ён зьяўляецца перадавым калгасам у раёне па выкананьні фінансавых абавязкаў перад дзяржавай. Калгас датэрмінова ўнёс 500 руб. сельска-гаспадарчага падатку 1932-33 году. Калгасьнікі датэрмінова і поўнасьцю разьлічыліся па падпісцы на пазыку «3-га рашаючага».

Калгас «Гігант» у рэалізацыі пазыкі «4-га завяршаючага году пяцігодкі» дасягнуў вялікіх посьпехаў. Трохтыднёвы даход калгасьнікаў складае зрыентыровачна 2.000 руб., падпіска-ж на новую пазыку дасягнула 2.800 руб., альбо 140 процантаў да трохтыднёвага даходу калгасьнікаў. Падпіскай ахоплены ўсе калгасьнікі ў разьмеры ад 20 да 150 рублёў. Старшыня камсоду тав. **Мацкевіч** падпісаўся на 150 рублёў, калгасьнік **Буйвідовіч** падпісаўся на 100 руб. і г. д. Падпіска працягваецца. Камсод і рэдкалегія насьценгазэты «Голас калгасьніка» паставілі сваёю мэтаю дабіцца падпіскі калгасьнікаў ня менш чым на 3.500 руб.

Гэтых посьпехаў калгас «Гігант» дасягнуў у выніку разгортваньня шырокай масавай работы і ўжываньня яе навейшых форм і мэтадаў. Насьценгазэтай, разам з камсодам калгасу, арганізаван спэцыяльны выпуск штодзённых нумароў насьценгазэты, прысьвечаны рэалізацыі пазыкі. Арганізавана дошка тэмпаў, з паказаньнем перадавых і адстаючых брыгад і перадавых калгасьнікаў. З газэтных выразак цэнтральных газэт арганізавана дошка паказу ходу рэалізацыі пазыкі па іншых калгасах і прадпрыемствах. Ва ўсёй рабоце шырока разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, грамадзкі буксір адстаючых. Уся масавая растлумачальная работа перанесена ў поле ў брыгаду. У часе абедзеных перапынкаў і па сканчэньні работы практыкуецца калектыўная чытка газэт і правядзеньне лятучых мітынгаў. Асаблівай увагі заслугоўвае актыўная работа старшыні камсоду тав. Мацкевіча і насьценгазэта «Голас калгасьніка».

На лятучым мітынгу, падагульваючы папярэднія вынікі рэалізацыі пазыкі, калгасьнікі калгасу «Гігант» пастанавілі праз газэту «Калгасьнік Беларусі» зьвярнуцца з адкрытым лістом да ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў БССР аб заканчэньні рэалізацыі пазыкі «4-га завяршаючага» да дню вызваленьня Беларусі ад белапалякаў (11 ліпеня).

Працягваючы падпіску ў сваім калгасе, калгас «Гігант» узяў на грамадзкі буксір адстаючыя ў рэалізацыі пазыкі калгасы «Будаўнік культуры» свайго сельсавету і «Пралетарскую перамогу», Грыцкаўскага с-савету. Адначасова калгасьнікі ўзялі на грамадзкі буксір аднаасобнікаў, для чаго калгас «Гігант» накіраваў буксірную брыгаду з лепшых калгасьнікаў-ударнікаў фінфронту на чале з старшынёй камсоду т. Мацкевічам. Буксірная брыгада формы і мэтады работы свайго калгасу пераносіць у адстаючыя калгасы.

Выходзячы з гэтага, Праўленьне Белкалгасцэнтру і Наркамфіну пастанаўляюць:

1. Старшыню камсоду калгасу «Гігант» тав. Мацкевіча прэм'яваць грашовай прэміяй у суме 150 руб. і адначасова ўзнагародзіць яго граматай Наркамфіну БССР як лепшага ўдарніка фінфронту. Выдаць ў распаряджэньне праўленьня калгасу, камсоду і рэдкалегіі насьценгазэты «Голас калгасьніка» 700 руб., для прэм'яваньня лепшых калгасьнікаў ударнікаў-фінфронту і сьценкораў 300 руб., на набыцьцё неабходных прылад і кіруючай літаратуры для выданьня газэты 100 р., для патрэб культурна-бытавых устаноў (дзіцячыя ясьлі)—300 руб.

2. Для ўручэньня прэмій камадыравать у калгас «Гігант» члена ЦКамсоду Калгасцэнтру тав. **Фэська В. І.**

3. Падтрымліваючы пачын калгасьнікаў калгасу «Гігант» аб скончэньні рэалізацыі пазыкі да 12 гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, прапанаваць усім калгассаюзам і райфа, шырока скарыстаўшы вопыт масавай работы калгасу «Гігант» у рэалізацыі пазыкі «4-га завяршаючага» і ў выкананьні іншых фінансавых мерапрыемстваў, перанёсшы яго ў практыку работы ўсіх калгасаў, да біцца скончэньня рэалізацыі пазыкі да дню вызваленьня Беларусі ад белапалякаў. Для правядзеньня гэтай работы мабілізаваць раённы фінансавы актыў і работнікаў Калгассаюзаў, пастанавіўшы пытаньне перад кіруючымі раённымі арганізацыямі аб мабілізацыі раённага актыву з тым, каб ахапіць выездам усе калгасы і вёскі раёну. 12 гадавіну вызваленьня Беларусі ад белапалякаў адначыць рапартамі перамог па фінансавым фронце, поўнай рэалізацыяй пазыкі завяршаючага году пяцігодкі па калгасьніках і аднаасобніках, сялянах БССР.

Старшыня праўленьня Белкалгасцэнтру МІЦЬКО.

Народны камісар фінансаў БССР ХАЦКЕВІЧ.

Пяцідзеньнік праверкі гатоўнасьці да ўборкі

Да жніва склясьці ў стагі тысячы тон сена

Больш гнуткасьці і апэрацыйнасьці ў рабоце

Барацьба за свячасовую падрыхтоўку да ўборачнай, апэрацыйнае кіраўніцтва сенакашэньнем і сіласаваньнем — партыяй пастаўлена ў парадак дню як адна з важнейшых баявых кампаній.

Імкна на ўборачнай ранаецца лёс ураджаю сацыялістычных палёў. Таму, на апэрацыйнае кіраўніцтва ўборачнай і павінна быць зьвернута сур'ёзная ўвага з боку партыйных і гаспадарчых арганізацый.

Абвешчаны «Правдой» пяцідзеньнік праверкі гатоўнасьці да ўборкі, пяцідзеньнік, які ўскалыхнуў шырокія калгасныя масы, рабочых саўгасаў і бядняцка-серадняцкае сялянства, — разам з гэтым паказаў, што ў радзе месц мы маем недапушчальнае ігнараваньне падрыхтоўкі да жніва і разгортваньне сенакашэньня.

Правядзеньне сенаўборачнай ня стала ў цэнтры ўвагі гаспадарчых арганізацый. Да апошняга часу на радзе адказьнейшых вучасткаў уборачнай не ліквідаваны прарывы. Гэта досыць выразна падкрэсьлена на нарадзе пры ЦКК НК РСІ, якая адбылася 2 ліпеня.

Да 10 ліпеня павінна быць закончана ўборка балотных і заліўных сена жацяй па ўсіх зонах БССР, але да апошняга часу мы стаім перад фактам неадвядзеньня сенажацяў у радзе месц. НКЗБ з вялікім спазьненьнем прыступіў да гэтай работы. У Рэчыцкім і Нараўлянскім раёнах дырэктыва НКЗБ аб скончэньні адводу сенажацяй была атрымана толькі ў другой палове чэрвеня, тады, калі трэба было касіць. Райза на мясцох таксама не праявілі патрэбнай гнуткасьці і апэрацыйнасьці ў гэтай справе. На масывах Загальле і Ведрычы да апошняга часу не закончаны адвод сенажацяй Луг трэсту. «Сьвіпаводу» вызначана 2.000 га сенажацяй, але адвод іх яшчэ ня зроблены. Таксама не закончаны адвод сенажацяй у радзе сельсаветаў Случчыны, Мазыршчыны і інш. раёнаў.

Няма дакладнасьці і ў складаньні плянаў. На масыве Абухаўшчына, Мазырскага раёну, адвялі сенажаці, дзе расьце 6-ці вяршковы лес. Толькі зараз райкаморніку даручана выправіць памылкі ў плянах. Гэта, бязумоўна, сьведчыць аб той блытаніне, якая стваралася ў апараце НКЗБ і ў паасобных райза ў справе адводу сенажацяй.

Забясьпечаньне ўборачнымі машынамі і інвэнтаром зьяўляецца рашаючым у правядзеньні сенаўборкі. Між тым, плян завозу сенакасілак выкананы толькі на 22 проц., конных граблёў — 39 проц. Кос завезена ў патрэбнай колькасьці, але Белсельснаб не праявіў належнай гнуткасьці ў плянаваньні і размеркаваньні ўборачнага інвэнтара. Напрыклад, у Жлобінскім раёне адчуваецца недахоп кос у той час, калі ў Нароўлі іх ёсьць больш чым трэба.

Асабліва востра стаіць пытаньне за бясьпечаньня ўборачных машын запаснымі часткамі і дэталямі. Завоз запасных частак выкананы ўсяго на 52 проц. Асноўнымі вытворцамі запасных частак зьяўляюцца заводы мясцовай прамысловасьці ў Воршы, Менску, Бабруйску, але ня гледзячы на тое, што яны забясьпечаны сыравінай, выраб запасных частак ганебна зрываецца. Патрэбны самыя рашучыя меры, каб прымусіць гэтыя заводы сваячасова выканаць плян выпуску запасных частак. Таксама зрываецца выраб бабак. Завод «Чырвоны мэталіст» у Віцебску замест 10 тысяч бабак выпусьціў да гэтага часу толькі каля 5.000.

Арганізацыя грамадзкага харчаваньня і культмасавае абслугоўваньне ўборачнай пастаўлена вельмі дрэнна. Амаль нідзе няма газэт, кніг. Сталоўкі працуюць дрэнна. У саўгасах: Пірэвічы, «Зара Захаду», «Камунар» нічога ня зроблена, каб паставіць грамадзкае харчаваньне на належную вышыню, не разгорнута загатоўка патрэбных прадуктаў.

Забясьпечаньне сенаўборачнай рабочай сілай па-ранейшаму не разгарнулася. Рад гаспадарчых арганізацый апартуністычна недаацэньваюць вярбоўку рабочай сілы для саўгасаў. «Сьвіпавод» і Белмалпрамтрэст нічога ня ведаюць пра тое, што робіцца ня мясцох у гэтай галіне. Патрэбны самыя рашучыя меры як з боку трэстаў, так і трыкутнікаў саўгасаў на мясцох.

Разгортваючы сенаўборку, на хаду ліквідуючы прарывы, партарганізацыі і зямельна-калгасныя органы на мясцох павінны цьвёрда памятаць, што жніва не за гарамі. Адвод сенажацяй, рамонт і разьмеркаваньне ўборачнага інвэнтара, арганізацыя працы, барацьба з абязьлічваньнем вучасткаў —адны з вузлавых пытаньняў, на якія павінна быць зьвернута максымальная ўвага.

Разам з гэтым трэба весьці самую рашучую барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай аднаасобнага сэктару.

Аднаасобны сэктар у БССР пакуль што займае значнае месца ў агульным балянсе сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Таму недаацэнка аднаасобніка, незабясьпечаньне сенажацьцю, ігнараваньне арганізацыйна-масавай работы сярод бядняцка-серадняцкага сялянства павінны разглядацца як адна з самых шкодных праяў апартунізму.

Барацьба за два ўкосы, бальшавіцкае правядзеньне жніва—гэты лёзунг павінен прасякнуць увесь зьмест практычнай работы вясковых ячэек.

Больш гнуткасьці, больш апэрацыйнасьці ў рабоце.

Двухдэкаднік замацаваньня ўліку па калгасах

З 10 па 30 ліпеня г. г. Белкалгасцэнтр абвясьціў двухдэкаднік замацаваньня ўліку па калгасах.

7 ліпеня ў Менску, Віцебску і Гомелі склікаецца міжраённыя куставыя нарады інструктароў па ўліку. Кожны калгас павінен выслаць на гэтыя нарады па адным інструктары.

Асноўная задача двухдэкаднику-дабіцца рашучага зруху ў наладжваньні ўнутрыкалгаснага ўліку, устанавіць адказнасьць за справу ўліку калгасных рахункаводаў і кіраўнікоў паасобных галін гаспадаркі (брыгадзіраў, заг. фэрмамі, кладаўшчыкоў, скаронікаў і г. д.).

Для правядзеньня двудэкаднику ў кожным калгасе павінна быць складзена праверачная брыгада з лепшага актыву калгасьнікаў з абавязковым уваходам у яе склад старшыні рэўкамісіі, члена праўленьня і рахункавода.

Работа праверачнай брыгады павінна быць пабудавана так, каб не пераварыць двухдэкаднік у рэвізію, але калі будуць заўважаны парушэньні ўліковай дысцыпліны, або злачынствы, брыгада абавязана высьветліць іх і дапаматчы наладзіць работу.

Асноўнымі аб'ектамі праверкі павінны быць:

Улік працы калгасьнікаў (улік працы брыгадзіраў, запісы ў працоўную кніжку працадзён, запісы ў кнігі ўліку працадзён); разьлікі з калгасьнікамі за работу, (выдача авансаў па колькасьці і якасьці патрачанай працы); улік усіх відаў маёмасьці і замацаваньне яе за адпаведнымі асобамі, брыгадамі (ліквідацыя абязьлічкі); улік выкананьня вытворчага пляну па паасобных галінах гаспадаркі. Улік фінансава-крэдытных апэрацый (грашовая кніга, складаньне і хаваньне пяршачных дакумантаў, разьлікі калгасу па пазыках, выкарыстаньне фондаў, мабілізацыі сродкаў і г. д.).

Упаўнаважаныя раёну, якія выяжджаюць у сельсаветы для правядзеньня кампаніі па наладжваньню ўліку, павінны арганізаваць сталыя вытворчыя нарады рахункаводаў пры сельсаветах. Задачы гэтых нарад—правяраць становішча ўліку асобных калгасаў, арганізаваць абмен вопытам паміж калгасамі ў справе наладжваньня рахункаводзтва.

Калгасцэнтр зварочвае ўвагу райкалгассаюзаў на выключнае значэньне правядзеньня двухдэкаднику, у наладжваньні калгаснага ўліку, як асноўнага вагара ў далейшым ходзе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

На 1-га ліпеня па саўгастрэстах БССР убрана сенажацяй

	Канюшыны	Нат. сенажацяй
Белмалпрамтрэст	9,5 проц.	0,4 проц.
Лугтрэст	—	0,2 проц.
Насентрэст	4 проц.	1 проц.

Аб чым гаворыць матар'ял рэйду

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Праведзены рэйд па праверцы падрыхтаванасьці раёну да ўборачнай паказаў, што да гэтай важнейшай кампаніі раённыя арганізацыі належна не падрыхтаваліся. Калі па калгасах пляны былі спушчаны 13 чэрвеня, дык па саўгасах яны спушчаны толькі 20 чэрвеня, а па сельсаветах толькі 21 чэрвеня.

Заўважаецца блытаніна ў правядзеньні сілосной кампаніі. Так, па сыстэме калгасаў плян сіласаваньня вызначаны ў 17.100 тон. Адначасова з гэтым: агульны раённы плян сіласаваньня, даны райза, складае таксама 17.100 тон. Гэтая няўвязка зьяўляецца вынікам недагаворанасьці паміж Наркамземам і Калгасцэнтрам.

Большасьць сельсаветаў пляны сена ўборкі і сіласаваньня паклалі пад сук но. А Харлапавіцкі і Бортнікаўскі сельсаветы зусім ня маюць іх і па сёнешні дзень.

Райземаддзел да гэтага часу не наладзіў апэрацыйнага кіраўніцтва ходам сенаўборкі. Райкалгассаюз не дае адпору паасобным калгасам, якія ўпар та зацягваюць касавіцу. Кіраўнікі калгасу «Колас» заяўляюць, што «касіць цяпер нельга, а трэба чакаць пакуль наладзіцца добрае надвор'е».

У калгасе «Сьвет» праўленьне лічыць, што раньняе сіласаваньне зусім ня трэба рабіць, спасылаючыся на тое, што няма зялёнай масы, у той час, як маецца ў наяўнасьці многа асакі, пуста зельля.

Калгасы: «Бальшавік», імя газэты «Камуніст», «Камінтэрн» заяўляюць, што сілос непатрэбны, бо хопіць сена.

Ня гледзячы на тое, што пара прыступіць да касавіцы, па радзе сельсаветаў, у прыватнасьці па Восаўскім і Рымавіцкім, яшчэ не адведзена сенажаць аднаасобнаму сэктару. Некаторая частка калгасаў таксама ня ведае дзе касіць.

Забясьпечаньне сенаўборачнай кампаніі машынамі і с.-г. інвэнтаром вельмі дрэннае. Белсельснаб праявіў у гэтым поўную бязьдзейнасьць. Да гэтага часу на складзе няма малаткоў, бабак і брускоў. З 50 вызначаных сенакасілак завезена толькі 16, з 75 конных грабель завезена 4, (2 грабель ляжаць на складзе з прычыны няспраўнасьці). Зусім адсутнічаюць запасныя часткі для с.-г. машын.

За машынамі не наладжаны належны нагляд. З гэтае прычыны машыны, якія павінны працаваць 8—10 год, выбываюць са строю праз 2—4 гады. Рамонт машын надзвычайна дрэнны. Райкалгассаюз не патурбаваўся паставіць на належную вышыню падрыхтоўку кіраўнікоў с.-г. машын. На курсах замест 40 чалавек навучаецца толькі 18. Райкалгассаюз арганізаваў гэтыя курсы толькі 24 чэрвеня, гэта значыць дацягнуў справу да самай касавіцы.

Арганізацыя працы ў калгасах і на сёнешні дзень зьяўляецца самым балючым месцам. Па значнай колькасьці калгасаў брыгады фактычна ня існуюць і калгасьнікі працуюць на сена ўборцы «агулам».

Надзвычайна дрэнна наладжаны ўлік працы і разьмеркаваньне рабочых па паасобных групах.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб апартуністычнай бязьдзейнасьці як з боку раённых арганізацый (райза, райкалгассаюз і райснаб), так і сельсаветаў і праўленьняў калгасаў. Па гэтай бязьдзейнасьці РКК РСІ павінна ўдарыць самым бязьлітасным чынам. Бліжэйшыя 2—3 дні павінны забясьпечыць рашучы пералом у ходзе падрыхтоўкі да ўборкі. Зрыўшчыкі сілосной кампаніі павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

А. ДАМБРОЎСКІ.

СЁНЬНЯ, 5-га ліпеня роўна а 7 гадзіне ўвечары
ў памяшканьні летняга саду „Прафінтэрн"
АДБУДЗЕЦЦА
УРАЧЫСТАЕ ПАСЕДЖАНЬНЕ ПЛЕНУМУ
МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ РСЧД
прысьвечанае дню IX гадзівіны абвяшчэньня канстытуцыі СССР,
разам з ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, ЦВК, СНК, Прэзыдыуму ЦСПСБ, гаркому КП(б)Б, гар. КК, ЛКСМБ і ГПС, пры ўдзеле прадстаўнікоў Чырвонай арміі, чырвоных партызан і рабочых прадпрыемстваў гораду.
ПАРАДАК ДНЮ:
1. 9 гадоў канстытуцыі СССР (дакл. т. Чарвякова)
2. Мастацкая частка.
УВАХОД НА ПЛЕНУМ: члены і кандыдаты гарсавету, члены ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, члены ЦВК, СНК, Прэзыдыуму ЦСПСБ, гаркому КП(б)Б і ЛКСМБ гар. КК і ГПС праходзяць пасваіх мандатах. Усе астатнія па білетах, распаўсюджаныхпраз гарпрафсавет.
Прэзыдыум Гарсавету

ДАЙЦЕ ЗАПАСНЫЯ ЧАСТКІ

ЖЛОБІН. (наш кар.). Жлобінская МТС сустракае сенаўборачную непадрыхтаванай. Асабліва пагражаючае становішча з забясьпечаньнем МТС запаснымі часткамі да машын. Не хапае частак для трактароў, жняярак, сенакасілак, малатарняў. Таксама не хапае значнай колькасьці ўборачных машын (12 конскіх грабель, 7 жняярак-самаскідак, 10 снопавязалак, 4 сіласарэзак).

Кіраўніцтва МТС ня ўпэўнена, што калгасы гэтымі машынамі будуць своячасова забясьпечаны. Тэмпы рамонту

На канфэрэнцыі у Лёзане

Германская дэлегацыя адхіліла прапанову дзяржаў-крэдытароў

ЛЁЗАНА. 3-7. Германская дэлегацыя ў заяве прадстаўніком германскага друку ў Лёзане ўказвае, што ёю адхілена прапанова дзяржаў-крэдыторaў на наступных матывах:

1. З прычыны таго, што вызначаныя сумы заключнага ўзносу могуць выклікаць у будучым цяжкасьці ў галіне транспарту;

2. З прычыны таго, што плян зьмяшчае гарантыйную агаворку ў адносінах ПАЗШ, якая хоць выключана з самога пляну, аднак фігуруе ў дадатковым пратаколе.

Далей германская дэлегацыя заяўляе, што апошнія паведамленьні аб пазіцыі ўраду ПАЗШ толькі ўзмацняюць германскі пункт гледжаньня аб недапушчальнасьці зьвязваньня праблем рэпарацый з міжсаюзьнікімі даўгамі. Неабходна адзначыць, што германская дэлегацыя ў гэтай заяве ўпяршыню афіцыйна пацьвярджае, што яна вядзе перагаворы аб сумах будучых плацежоў.

Перадвыбарчая кампанія ў Германіі пачалася

Працоўныя Бэрліну--пад сьцягам кампартыі

БЭРЛІН. 3-7. Пачалася прадвыбарчая кампанія ў германскі рэйхстаг. У Бэрліне першы дзень кампаніі прайшоў пад знакам рэвалюцыйнага адзінства фронту. З раніцы ва ўсіх раёнах Бэрліну пачалі зьбірацца калёны рэвалюцыйных рабочых і беспрацоўных, каб накіравацца да **Люстгартэну**, на арганізаваны кампартыяй масавы мітынг.

Вуліцы, па дарозе да Люстгартэну быў запоўнены дзесяткамі тысяч рэвалюцыйных працоўных Бэрліну, выступаўшых пад камуністычнымі сьцягамі. Асабліва выдзяліся атрады саюзу барацьбы супроць фашызму, а так сама выматлізія атрады пралетарскай самаабароны. У дэманстрацыі брала ўдзел шмат сацыял-дэмакратычных рабочых і членаў рэспубліканскага сьцягу. Паліцыя спрабавала ў многіх мясцох спрэчкавацца сутычкі, пускаючы ў ход супроць дэманстрантаў, бяз усякай прычыны, гумовыя дубінкі.

Падрыхтоўка нападу на СССР на поўным ходзе

БЭРЛІН. 3-VII. Газэта **«Вэльт ам Абэнд»** паведамляе падрабязнасьці аб рашэньнях, прынятых на нарадах **малой Антанты.** Нарады адбываліся некалькі тыдняў назад у **Празе, Бухарэсьце, і Белградзе.** Згодна прынятых рашэньняў, у выпадку патрэбы павінны быць мабілізаваны ўсе грамадзяне краін Малой Антанты ва ўзросьце ад 16 да 60 год. Далей, як паведамляе газэта, на нарадах быў вызначаны колькасны склад пасобных армій гэтых дзяржаў пасьля аб'яўленьня мабілізацыі.

Газэта паведамляе, што польскі генштаб у сучасны момант працуе над узмацненьнем танкавых атрадаў, якія ўжо зараз павінны быць даведзены да колькаснага складу ваеннага часу.

Кампартыя Францыі арганізуе масы

ПАРЫЖ. 2-7. Пад лёзунгам «разбурым новую эмову», **«Юманітэ»** друкуе адозву палітбюро ЦК францускай кампартыі, у якой гаворыцца:

«Урад хоча перашкодзіць таму, каб пралетары транспарту і ваенных заводаў выкрывалі адпраўкі рыштунку для вайны. З гэтай мэтаю спраўдешная справа аб шпіянажы, прычым сацыялістычныя лідэры падтрымліваюць у гэтым урад».

Адозва зьвяртаецца да ўсіх працоўных гораду і вёскі, у прыватнасьці да сацыялістычных рабочых з заклікам —хуткім і магутным пратэстам прыму сіць урад адступіць; выступаць супроць вайны, на абарону СССР; абіраць на сваіх сходах дэлегатаў на антываенны канпрэс у Жэнэве; ствараць камітэты назіраньня на ваенных заводах, на чыгуначных станцыях і ў партох; арганізаваць барацьбу мас супроць вырабу і перавозкі вайсковых матар'ялаў; выкрываць падрыхтоўку да вайны; арганізаваць і правесьці з 28 ліпеня па 1-га жніўня тыдзень барацьбы супроць вайны; патрабаваць поўнай амністыі для палітвязьняў і не адкладнай адмены катаржных законаў, а таксама закону аб прамысловым шпіянажы, а на справе за тое, што яны выкрывалі ваенную падрыхтоўку французскага імпэрыялізму.

Пад націскам рабочых мас рэфармісты „згадзіліся" на абвяшчэньне ўсеагульнай забастоўкі

ПАРЫЖ. 3-VII. З Брусэлю паведамляюць, што пад націскам мас лідэры рэфармісцкага саюзу гарнякоў у Барынажы змушаны былі «згадзіцца» на абвяшчэньне 6-га ліпеня ўсеагульнай забастоўкі гарнякоў у басэйне Барынажу.

Наколькі вялікія імкненьні мас ня спыняць барацьбу, паказвае той факт, што многія дэлегаты патрабавалі пашырэньня забастоўкі на ўсю краіну. Згода рэфармістаў на ўсеагульную забастоўку азначае толькі маньўр, каб паслабіць усё ўзрастаючы ўплыў камуністаў і рэвалюцыйнай прафапазыцыі на гарняцкія масы Бэльгіі.

Гераічная забастовачная барацьба бэльгійскіх гарнякоў

ПАРЫЖ. 2-7. Як паведамляюць з Бэльгіі, забастоўка гарнякоў супроць скарачэньня зарплаты ў вугольным раёне Борынаж павялічваецца. У руху ўдзельнічае звыш 10 тыс. рабочых.

Па ўсім раёне праходзяць дэманстрацыі бастуючых рабочых, якія ладзяць на вуліцах барыкады для таго, каб перашкодзіць перавозцы штрэйкбрэхэраў, перакульваюць трамвайныя вагоны і аўтамабілі. У раёне забастоўкі згрупавана вялікая колькасьць жандармэрыі. Сакратар рэвалюцыйнай прафапазыцыі Вандэрбоом арыштаваны. Рэфармісцкія прафсаюзы стаяць цалкам на баку прадпрымцаў, заяўляючы, што скарачэньне зарплаты было прадугледжана згодай з прамы слоўцамі.

Японія „раіць" манчжурскаму ўраду

ТОКІЁ. 2-7. Паводле паведамленьня агенцтва **«Сімбун Рэнго»** і газэты **«Асахі»**, японскае міністэрства замежных спраў прапанавала японскаму консулу ў **Чаньчуне** раіць манчжурскаму ўраду прыняць распрацаваны японскім міністэрствам замежных спраў кампраміс па пытаньні аб манчжурскіх мытніцах.

Японскі ўрад парашыў цьвёрда па сярэднічаць паміж Нанкінам і манчжурскім урадам, жадаючы захаваць цэласнасьць сыстэмы кітайскіх морскіх мытняў і забясьпечыць інтарэсы чужаземных крэдыторaў. Японскі ўрад не дазволіць падпяцця без папярэдняй згоды манчжурскага сьцягу над Дайрэнскай мытніцай. Адначасова японскаму консулу прапанавана зьвярнуць увагу манчжурскага ўраду на тое, што знаходзіцца ў зоне П.-М. чыгункі, парушыў права П.-М. чыгункі. Паводле слоў манчжурскага кар. газ. «Асахі» і агенцтва «Дэмпо Цусін», манчжурскі ўрад парашыў не згаджацца з кампрамісам і працягваць кіраўніцтва манчжурскімі мытніцамі.

Катастрафічная паводка ў Японіі

ТОКІЁ. 2-VII. З прычыны нясупынных дажджоў у заходняй Японіі (прафэктура Карусіма Нара і Ніога) шматрэк выйшлі з берагоў. Затоплена звыш 10.000 дамоў і паразмываны чыгункі. Маюцца весткі аб тым, што загінула звыш сотні жыхароў. Чыгуначныя зносіны ў рядзе месц спынены.

„Беспрацоўныя не жадаюць паміраць з голаду"

Ультыматыўнае патрабаваньне неадкладнай дапамогі

ГЕЛЬСІНГФОРС. 2-7. На паседжаньне абшчыннага самакіраўніцтва ў Карыэле зьявілася дэлегацыя беспрацоўных і прад'явіла ад імя беспрацоўных ультыматыўнае патрабаваньне неадкладнае дапамогі галадуючым беспрацоўным.

Прад'яўлены да абшчыннага самакіраўніцтва пісьмовы зварот заканчваецца заявай, што, у выпадку невыкананьня выстаўленых патрабаваньняў, беспрацоўныя ня будуць чакаць дапамогі, а забяруць харчы з крам і складаў, бо не жадаюць паміраць з голаду.

Па СССР

Цэнтралізаваны плян загатоўкі малака скарочваецца

МАСКВА. 4-VII. СНК пастанавіў скараціць цэнтралізаваны плян загатоўкі малака, у перавадзе на масла, па калгасах, калгасьнічах і аднаасобных працоўных гасьпадарках, устаноўлены на 1932 г., на 22,5 тыс. тон і павялічыць плян здачы па саўгасах на 7.800 тон і ўдакладніць гэтыя дагаворы ў сувязі з адбыўшымся пераразьмеркаваньнем штату.

Цэнтралізаваны плян загатовак малака для выпрацоўкі сыру ўстаноўлены толькі для асноўных сыраварных раёнаў у разьмеры 12,5 тыс. тон замест 25 тыс. тон старога пляну.

СНК саюзных рэспублік, краявыя і абласныя выканкомы абавязаны аказваць садзейнасьць калгасам і аднаасобікам выконваць дзяржаўны плян у загатоўках. Дзяржаўныя і кааперацыйныя загатоўчыя арганізацыі павінны прымаць на сваіх заводах малако, ад акуратна выконваючых дзяржаўны плян загатовак калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў для яго перапрацоўкі і выдачы з малака таго прадукту, які тыя жадаюць атрымаць (масла, сыр, сьмятана і інш.)

Спыняецца цэнтралізаванае рэгуляваньне і плянаваньне загатовак нязьнятага малака. СНК СССР прапанаваў не ўстанаўляць плянавых загатовак нязьнятага малака за выключэньнем раёнаў, якія забясьпечваюць важнейшыя прамысловыя цэнтры.

(ТАСС).

Забастоўка чыгуначнікаў у Мэксіцы

НЬЮ-ЁРК. 2-7. Як паведамляюць з Мэксікі, служачыя чыгуначнай кампаніі «Пульман» абвясьцілі забастоўку ў адзнаку пратэсту супроць 10-процантнага зьніжэньня зарплаты. Кампанія «Пульман» абслугоўвае спальныя вагоны ва ўсіх мэксіканскіх чыгунках.

У Мэксіцы ня спыняецца забастаўкі чыгуначных рабочых «паўднёвай цяпакіянскай чыгункі».

Банкрутства буйнейшага банка ў Румыніі

ВЕНА. 1-7. Паводле паведамленьня з Бухарэсту, буйнейшы ў Румыніі аграрны банк **«Крэдытуль Рураль»**, зьвязаны з лібэральнай партыяй, абвясьціў аб сваёй неплатаздольнасьці. Крах банку выклікаў паніку ў румынскіх фінансавых і эканамічных колах.

Буйныя банкруцтвы ў ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК. 2-7. Збанкрутавала адна з буйнейшых кампаній **«Пэншыонэл Электрык Паўэр Компані».** Капітал кампаніі складаў 600 млн. даляраў.

Збанкрутавала таксама т-ва **«Пэншыонэл Электрык Сэрвіз Корпорэйшэн».**

Ваенныя самалёты бамбардуюць бастуючых рабочых

НЬЮ-ЁРК. 2-7. Паводле паведамленьня агенцтва **«Ассошыэтэд прэс»**, у штаце Огайо ваенны аэраплан скінуў бомбы, якія выклікаюць сьлезацячэньне, над пікетамі бастуючых гарнякоў, аказваўшых супраціўленьне штрэйкбрэхерам.

У Саўгарыі арганізуецца саюз прыяцеляў СССР

ВЕНА. 2-VII. Паводле паведамленьня з Сафіі, там адбыўся арганізацыйны сход Саюзу прыяцеляў СССР у Баўгарыі з удзелам дзяча-буржуазных і пралетарскіх пісьменьнікаў, масткоў і палітычных дзеячоў. У правінцыях арганізуюцца сэкцыі саюзу.

Крызіс паралізуе „пачуцьце" у Уругваі

НЬЮ-ЁРК. 2-7. Як паведамляе **«Ассошыэтэд прэс»**, у **Мандэвідэо** (сталіца Уругваю) моцна скараціўся рух аўтамабіляў, аўтобусаў і грузавікоў, з прычыны недахопу газаліну і газы. Недахоп зьяўляецца вынікам зьніжэньня на 40 проц. увозу гэтых прадметаў з прычыны валютных цяжкасьцяй Уругваю. Забаронена выдатаваць на кожную машыну больш 5 літр. газаліну і газы.

Надзвычайныя дэкрэты дэйнічаюць

БЭРЛІН. 2-7. З прычыны ўступіўшага гэтымі днямі ў моц надзвычайнага дэкрэту аб скарачэньні дапамогі інвалідам, на працягу ўчарашняга дня адбылося 3 выпадкі самагубства інвалідаў.

Румынскія ахраньнікі стараюцца разьбіць рабоча-сялянскі выбарчы блёк

ВЕНА. 28-6. Паводле паведамленьня з Бухарэсту, румынскі ўрад усямерна абастрае прадвыбарчы тэрор супроць рабоча-сялянскага блёку з мэтаю перашкодзіць яго ўдзелу ў выбарах.

Ва ўсіх прамысловых цэнтрах ахранка абаружыла судовыя будынкі з мэтаю перашкодзіць падачы для рэгістрацыі кандыдацкіх сьпісаў рабоча-сялянскага блёку. У мясцох дзе блёку, ня гледзячы на тэрарыстычныя дзеяньні ахранкі, удалося дамагчыся зарэгістраваньня сваіх кандыдацкіх сьпісаў, ахранка арыштоўвае кандыдатаў блёку. Арыштаваныя актывісты блёку падвяргаюцца зьвярскім катаваньням. Арыштаваныя абвясьцілі галадоўку.

Пазыку „4-га завяршаючага"—у масы

Закончыць рэалізацыю пазыкі да 10-га ліпеня

Вучыцца ў перадавых

Рабочыя, калгасьнікі і працоўнае насельніцтва Мазырскага раёну з вялікім уздымам творчага энтузіязму на сацыялістычных палёх суторэлі дэкрэт ураду аб выпуску новай пазыкі «4-га завяршаючага году пяцігодкі». Гэты энтузіязм выявіўся ў масавай падпісцы на пазыку калгасьнікаў, якія падпісаліся на 100 і больш проц. свайго трохтыднёвага заработку.

Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва на хутчэйшае поўнае скончэньне падпіскі ,калгасьнікі Мазыршчыны дабіліся значных вынікаў. На 2-га ліпеня па раёне кантрольнае заданьне выканана на 73,1 проц.

Асабліва актыўна правялі рэалізацыю пастаўнікі, якія падпісаліся на 100 проц. свайго месячнага акладу, і разгарнулі шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў, чым практычна дапамаглі мясцовым арганізацыям у правядзеньні кампаніі.

Настаўнікі Ліпаўскага сельсавету падпісаліся на пазыку на 1.015 руб.

Але разам з гэтым у Мазырскім раёне ёсьць такія сельсаветы, якія ў рэалізацыі пазыкі адстаюць. Так, напрыклад, Дудзіцкі сельсавет да гэтага часу ніякай растлумачальна-масавай работы па сельсавеце не правёў, нават ня былі праведзены сходы па калгасах і вёсках з растлумачэньнем палітычнай сутнасьці пазыкі.

Ганебнае адставаньне паасобных сельсаветаў павінна быць ліквідавана разгортваньнем масавай работы. Адстаючыя сельсаветы Мазырскага раёну, скарыстаўшы вопыт перадавых, павінны выйсьці ў рады пераможцаў.

Чопік

Навуковыя працаўнікі не павінны адставаць

Зараз-жа пасьля апублікаваньня дэкрэту аб выпуску новай пазыкі ЦБ і Менскае гарбюро сэкцыі навуковых працаўнікоў зьвярнуліся з адозвай да навуковых працаўнікоў Беларусі аб хутчэйшай рэалізацыі яе. Заклік знайшоў гарачае падтрыманьне з боку асобных масавых сэкцый.

Першымі па рэалізацыі пазыкі ідуць навуковыя працаўнікі і асьпіранты інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б, якія падпісаліся на 125 проц. месячнага заработку, за імі—аграхімічная лябараторыя—на 115 проц., БАН—на 105 проц., мэдінстытут—на 104 проц.

Побач з гэтым, ёсьць установы, якія ганебна адстаюць. Так, напрыклад, інстытут сьвінагадоўлі на сёньняшні дзень рэалізаваў пазыку на 92 проц. свайго месячнага заработку, будаўніцтва інстытут—на 96 проц. і г. д. ЦБ прапанавала адстаючым сэкцыям узмацніць растлумачальную работу з тым, каб у бліжэйшыя 2—3 дні поўнасьцю ліквідаваць адставаньне і дабіцца поўнага ахопу ўсіх навуковых працаўнікоў пазыкай «4-га завяршаючага».

Данільчык.

Ліквідаваць запазычанасьць

СЛУЦАК. Калгасьнікі перадавога калгасу «Чырвоная зорка», Серагаўскага с/с, Слуцкага раёну, абгаварыўшы пытаньне аб падпісцы на пазыку «4-га завяршаючага» падпісаліся кожны на 25 руб. Разам з гэтым калгасьнікі пастанавілі ліквідаваць запазычанасьць за «3-ці рашаючы» у суме 1.000 руб. Рад калгасьнікаў падпісаліся на пазыку па 30-40 руб. Ужо зараз па калгасе падпіска на пазыку складае 4.000 руб.

ЦК КП(б)Б тав. Гікало, НКФ БССР тав. Хацкевічу, прыемстваў ГК КП(б)Б тав. Кавальчуку ЦП саюзу гарадзкіх прадтав. Юдзіну

Калектыў рабочых і служачых гасьцініц г. Менску ў колькасьці 75 асоб, месячны аклад пэнсіі якіх складае суму ў 6225 р., падпіскай на пазыку «4-га завяршаючага» ахоплены на 6925 р., або 111,24 проц.

Запэўніваем Ленінскі ЦК КП(б)Б, што і далей будзем змагацца за выкананьне заданьняў у вызначаныя тэрміны.

Няхай жыве тав. Сталін, верны кіраўнік камуністычнай партыі бальшавікоў!

Сакратар ячэйкі КП(б)Б **Крутковіч.**
Дырэктар кіраўніцтва гасьцініцам: **Сосін**
Старшыня групкому **Высеўка.**
Старшыня камсоду **Бабіор.**

Лепшыя прэміяваны

Цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту і апчадсправе пры прэзыдыуме ЦВК БССР разгледзеўшы пытаньне ходу рэалізацыі пазыкі па часьцях №-й каўдывізіі пастанавіла прэм'яваць лепшых ударнікаў і актывістаў, якія паказалі лепшыя ўзоры ў разгортваньні грамадзка-масавай работы па распаўсюджваньні пазыкі і наладжваньні апчадсправы.

Прэм'яваны наступныя таварышы: па № каўпалку—справавод скарбніка тав. Капіна—75 руб., старшага пісара штаба тав. Дзяцел—75 руб., паліткіраўніка кульэскадрона тав. Прашынікава—75 руб. і граматай, па №-м каўпалку — начальніка сувязі палка тав. Жукава — 75 руб., загадчыка справаводствам тав. Барэноўскага—75 руб., чырвонаармейца — сакратара партячэйкі тав. Сікорскага—75 руб і граматай.

Е.

Ударнікі ўборачнай—ударнікі фінфронту

Сярод рабочых саўгасу «Зялёны луг» (Менск) пазыка «4-га завяршаючага» на 27 чэрвеня рэалізавана 120 проц. Ударнікі сяўбы і ўборачнай абвясьцілі сябе ўдарнікамі фінфронту.

Лепшыя ўдарнікі саўгасу падпісліся на пазыку звышмесячнай зарплаты. Так тав. **Лапцэвіч** падпісаўся на 130 проц. месячнай зарплаты, тав. **Белы**—на 130 проц., тав. **Шыбко**—на 140 проц. і тав. **Казелька**—на 200 проц. Рэалізацыя пазыкі праходзіла пад знакам сацспаборніцтва паміж брыгадамі і асобнымі рабочымі.

М. Пашкевіч.

Дадаткова падпісаліся на пазыку

Работнікі энэргаддзелу НДІ прамысловасьці ,члены інжынэрна-тэхнічнай сэкцыі. Бартаноўскі, Пяска і Дашчэтаў дадаткова падпісаліся на пазыку «4-га завяршаючага» звыш месячнага заработку. Першыя два падпісаліся на 100 проц. месячнага заработку і трэці на 125 проц.

Яны выклікалі пасьледаваць іх прыкладу наступных таварышоў: Кастэнка, Іофэ, Тэпарэ, Любоншыца і Жукава і ўсіх інжынэрна-тэхнічных работнікаў і навуковых працаўнікоў гор. Менску.

Б.

Зьнішчыць пустазельле, адваяваць урэджай

У галіне сельскай гасьпадаркі XVII партканфэрэнцыя паставіла задачай рашучае павышэньне сельска-гасьпадарчай прадукцыі, павышэньне ўраджайнасьці калгасных і саўгасных палёў. Няўхільна ажыцьцяўляючы дырэктывы партыі аб арганізацыйна-гасьпадарчым у масавым калгасаў і сацыялістычным перавыхоўваньні калгасных мас, мы павінны дабіцца высокакаэфэктыўнай прадукцыі с.-г. вытворчасьці.

У агульным ланцугу барацьбы за высокі ўраджай канкрэтнымі мерапрыемствамі зьяўляюцца барацьба проці засьмечанасьці палёў.

Бясспрэчна, што ў барацьбе з засьмечанасьцю палёў, рашаючую ролю ў нас павінны адыгрываць буйныя гасьпадаркі (калгасы, саўгасы). На вялікі жаль, трэба адзначыць, што арганізацыйны бок гэтай справы застаецца ў нас амаль не наладжаным. Недастатковa праводзіцца таксама і шырокая прапаганда ў масах самых тэхнічных прыёмаў барацьбы з пустазельлем. Многія важнейшыя спасабы барацьбы з засьмечанасьцю палёў застаюцца мала кому вядомымі. А для таго, каб правільна арганізаваць барацьбу з пустазельлем, трэба дасканала знаць прыроду пустазельля.

Шкодна**сьць пустазельля** відна нават з таго, што **адзін толькі аўсюк у 1½ разы больш высушае глебу, чым пшаніца.** Сьмецьцёвыя расьліны забіраюць з глебы тыя спажыўныя матэрыі, якія так патрэбны для культурных расьлін. Палявая рэдзька, напрыклад, паглынае з глебы ў 2-е больш азоту і фасфарнай кіслаты і ў 4 разы больш вапны, чым авёс, які гэта пустазельле засьмечвае.

Пустазельле адымае ў дзяржавы 200 млн. цнт. хлеба. Праблема барацьбы з пустазельлем мае вялікае гасьпадарчае значэньне. Засьмечанасьць нашых пасеваў роўны ў сярэднім 25—30 проц. У БССР штогод ад пустазельля на льняных пасевах страты складаюць каля 15-ці млн. руб. Пустазельле надзвычайна плодаюсна. Напрыклад, адна расьліна кукалю дае 2400 зярнятак, а ёсьць такія расьліны, якія даюць 100 тыс. і да 730 тыс. зярнятак, (горкі палын, галаўня). Засьмечанасьць нашых глеб у сярэднім дасягае на га ад 10—16 цнт. насеньня пустазельля, што складае ад 10 — 20 мільярдаў зярнятак на 1 га.

У распараджэньні кожнага калгасу і саўгасу ёсьць праверанымі практычкай сродкі барацьбы з пустазельлем. Дасканалая ачыстка пасеўнага матар'ялу да пасеву — гэта толькі пачатак барацьбы з пустазельлем. Асноваж барацьбы павінна заключацца ў тэхніцы паляводзтва і зьнішчэньні пустазельля ў глебе, заражанай насеньнем і карэньнямі пустазельля.

Умядзяньне севазвароту — асноўная гарантыя зьнішчэньня пустазельля. Але ў самым севазвароце патрэбна весьці правільную апрацоўку глебы. Якжа гэта зрабіць? Трэба адразу пасьля ўборкі ўраджаю правесьці ўзорванье, або лушчэньне глебы. Гэта затрымлівае або зусім спыняе разьвіцьцё шматгадовага пустазельля (пырнка).

Найлепшых вынікаў зьнішчэньня пустазельля можна дасягнуць апрацоўкаю парамі. Узорваньне неабходна праводзіць своячасова.

Паўвярхоўная апрацоўка робіцца прыблізна да паловы лета — у гэты час прыступаюць да дваеньня. Пры дваеньні праводзіцца больш глыбока пульхненьне глебы.

Да спосабаў барацьбы з пустазельлем трэба аднесьці і ўвядзеньне шырокарадных пасеваў збожжавых культур, калі, як і пры прапашных культурах ужываецца шамжрадавая апрацоўка глебы. Такую апрацоўку можна праводзіць у пасева хпроса, як вядома, гэтая культура тіне ад пустазельля, а ручное поліва эканамічна ня выгодна. Пры шырокіх адлегласьцях паміж радамі можна выкарыстаць конную або маторную цягу. Чым раней палоць, тым лягчэй зьнішчаюцца ўсходы пустазельля.

Полка ёсьць лепшы сродак для ачысткі пасеваў ад большасьці пустазельля. Поліва павышае ўраджайнасьць некаторых культур амаль на 100 проц. (лён).

Апроч поліва барацьбу з пустазельлем можна праводзіць хімічнымі спосабамі.

Ва ўмовах вядзеньня буйнай сацыялістычнай гасьпадаркі, трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на хімічныя спосабы барацьбы з пустазельлем. Гэты спосаб можна машынізаваць, што скараціць патрэбу ў рабочай сіле.

Кожны саўгас і калгас павінны зьвярнуць асаблівую увагу на выкананьне пастановы калегіі НКЗБ і праўленьня Калгасцэнтру аб правядзеньні праполачнай і ўборачнай кампаніі. На час праполачнай кампаніі трэба арганізаваць сталыя брыгады з прымацаваньнем да іх поўных вучасткаў; асабліва неабходна зьвярнуць увагу на расстаноўку сіл у самой брыгадзе, каб усе ўдзельнікі яе былі поўнасьцю нагружаны. Адначасова патрэбна рашуча весьці барацьбу з цякучасьцю ў брыгадах, канчаткова ліквідаваць абязьлічку палявых вытворчых вучастка ў.

П. Вайцэховіч.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

АБ РАЗГОРТВАНЬНІ РАБОТЫ САВЕТАЎ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ТОРФАРАСПРАЦОВАК

Надаючы выключна вялікае значэньне для ўсёй народнай гаспадаркі БССР сваячасовае і поўнае выкананьне пляну торфараспрацовак, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Адобрыць ініцыятыву Арґінстру Прэзыдыуму ЦВК БССР па арганізацыі паходу саветаў, сэкцый і дэпутацкіх груп торфазаводаў і заводаў спажыўцоў торфу за выкананьне пляну торфазагатовак 1932 году. Прадстаўленую Арґінстрам Прэзыдыуму ЦВК БССР праграму паходу саветаў, сэкцый і дэпутацкіх груп за выкананьне пляну торфараспрацовак правесьці з 1-га ліпеня па 1-е жніўня 1932 г.

3. Для забясьпечаньня сыстэматычнага і апэрацыйнага кіраўніцтва паходам вылучыць тройку ў складзе: загадчыка Арґінстру Прэзыдыуму ЦВК БССР тав. **Хілімонава**, прадстаўніка Упаўнаважанага Наркамцяжу і рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь».

Арганізацыю паходу і кіраўніцтва ім у раёнах, дзе ёсьць торфазаводы, усклаўсьці на сакратароў РВК і гарадзкіх саветаў.

Для аказаньня практычнай дапамогі РВК і саветам у арганізацыі паходу даручыць Арґінстру Прэзыдыуму ЦВК БССР мабілізаваць ня менш 10 асоб з ліку работнікаў ЦВК, Белторфаб'яднаньня і Наркамцяжу і накіраваць іх у раёны торфаздабычы для канкрэтнага ажыцьцяўленьня праграмы паходу.

4. Даручыць рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» разгарнуць шырокае асьвятленьне на сваіх старонках работы саветаў, сэкцый і дэпутацкіх груп торфазаводаў па выкананьні пляну торфаздабычы і аказаць канкрэтную дапамогу грамадзкім арганізацыям торфазаводаў па разгортваньні работы пазавога друку (шматтыражкі і насьценгазэты) на торфазаводах.

5. Для падвядзеньня вынікаў паходу саветаў, сэкцый і дэпутацкіх груп за выкананьне пляну торфараспрацовак і распрацоўцы далейшых мерапрыемстваў па разгортваньні масавай работы саветаў на торфазаводах лічыць мэтазгодным у канцы сэзону торфараспрацовак склікаць Усебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп торфазаводаў разам з прадстаўнікамі партыйных, прафэсіянальных і гаспадарчых арганізацый торфазаводаў.

Месца скліканьня зьлёту дэпутацкіх груп торфазаводаў устанавіць на адным з торфазаводаў, які паказаў моцныя паказьнікі выкананьня пляну торфаздабычы, арганізацыі масавай работы дэпутацкай групы і ажыцьцяўленьня праграмы паходу.

6. Прыняць да ведама паведамленьне Упаўнаважанага Наркамцяжу, што для правядзеньня паходу і на прэміяваньне лепшых дэпутацкіх груп торфазаводу ім асыгнавана 4.000 р. Прапанаваць Белторфаб'яднаньню выдзяліць таксама для гэтай жа мэты адпаведныя сродкі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

29 чэрвеня 1932 г.
г. Менск.

Усім райза

(Радыёграма)

Ход праполкі гародаў, палявых культур, асабліва ільну, а таксама падыманьне панару праходзіць зусім нездавальняюча, што ставіць пад пагрозу падвышэньне і поўнае захаваньне ўраджаю.

Прапаную тэрмінова абгаварыць гэта пытаньне на прэзыдыуме РВК, намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі адставаньня з тым, каб праполка і падыманьне панараў быці праведзены ва ўстаноўленыя тэрміны.

Аб ужытых захадах і рэзультатах паведаміце не пазьней 8 ліпеня.

Нарком Земляробства БССР
РАЧЫЦКІ.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

Агіт-масавы аддзел ЦК КП(б)Б склікае 5-га ліпеня а 7 г. увечары пад старшынствам сакратара Ц КП(б)Б—тав. РЫСКІНА нараду таварышоў, якія выяжджалі ў раёны па пытаньні прасоўваньня тавараў у вёску і разгортваньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня.

Яўка таварышоў з надрыхтаванымі дакладамі абавязкова.

Нарада адбудзеца ў зале паседжаньняў ЦК (4 паверх).

Запрашаюцца прадстаўнікі газэт.

Сакратар агіт-масавага аддзелу ЦК КП(б)Б ПУТЫРСКАЯ

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня
З ЖЫЦЬЦЯ КАРМЭЛЮКА Пачатак а 6, 7-30, 9 і 10-30
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз.
НЯВОЛЬНІКІ МОРА

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 64

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

4 ліпеня 1932 г. гор. Менск.

аб парадку сьвяткаваньня 6 ліпеня—дню 9 гадавіны канстытуцыі СССР

Менскі Гарадзкі Савет Рабоча-Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў **пастанаўляе:**

1. Абавязаць кіраўнікоў дзяржаўных установаў, грамадзкіх, прафэсыянальных, кааперацыйных і жактаўскіх арганізацый да 17 гадз. 5 ліпеня ўпрыгожыць займаемыя імі памяшканьні і належачыя домаўладаньні сьцягамі, лёзунгамі і ілюмінаваць іх.

2. Гандаль ва ўсіх крамах утвараецца ў звычайным парадку.

3. Усе сталоўні працуюць нармальна.

4 Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на РС міліцыю.

5. Пастанова гэтая ўваходзіць у моц з дню апублікаваньня

Нам. старшыні Гарсавету **Млодак**
Сакратар Менгарсавету **Люцько**

Кошт публікацыі аб згубе аднаго дакуманту 2 рублі

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 63

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

4 ліпеня 1932 г. гор. Менск.

аб парадку сьвяткаваньня 11-га ліпеня—дню аслабаненьня Беларусі ад белапалякаў

Менскі Гарадзкі Савет Рабоча-Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў **ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Абавязаць кіраўнікоў дзяржаўных установаў, грамадзкіх, прафэсыянальных кааперацыйных і жактаўскіх арганізацый да 17 гадз. 10-га ліпеня ўпрыгожыць займаемыя імі памяшканьні і належачыя домаўладаньні сьцягамі, лёзунгамі, плякатамі і ілюмінаваць іх.

2. Усе кааперацыйныя і дзяржаўныя гандлюючыя магазыны абавязаць да 17 гадзін 10 ліпеня арганізаваць вітрыны сваіх тавараў і склаасьці дыяграмы сваіх дасягненьняў і росту за 12 год.

3. Гандаль ва ўсіх крамах утвараецца ў звычайным парадку.

4. Усе сталовыя працуюць нармальна.

5. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на РС міліцыю.

6. Пастанова гэтая ўваходзіць у моц са дню апублікаваньня.

Старшыня Гарсавету **Валодзька**
Сакратар **Люцько**

ЛІКВІДКОМ БЕЛСАДСАЮЗУ

даводзіць да ўсеагульнага ведама, што работа па ліквідацыі ім ужо скончана і з 5 ліпеня 1932 году ліквідком лічыцца распушчаным

Ліквідком Белсадсаюзу

10 ліпеня 1932 г. у горадзе Менску скліканецца 4-ы чарговы пашыраны пленум БРК Саюзу Лесдэўрабочых

з удзелам старшынь буйных ФЗМК і леварабочкомаў.

У сувязі з важнасьцю пытаньняў, стаўтых на абвестцы дню, яўка усіх членаў і кандыдатаў пленуму, а таксама і старшынь ФЗМК і райрабочкомаў і дырэктараў заводаў, якім паслана спецыяльнае запрашэньне—абавязкова.

ПРЭЗЫДЫУМ

Упаўнаваж. Галоўлітбелу № А-53.

Друкарня імя Сталіна

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2